Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вараціюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	7 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	—20 к.
мясцовыя	—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасярод тэксту 1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Зьвыш тарыфу спрацыя 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант 35 кап.
За кожны дадатковы 15 „
Бесплацныя і чырвонаармейцы за дакумант 15 „
За кожны дадатковы 5 „
Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-кы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 211 (2103) Субота, 17-га верасьня 1927 г.

Да 10-й гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі.

У пэнядзелак, 19-га верасьня, а 10-й гадзіне раніцы, у залі пасяджэньняў Прэзыдыуму ЦВК пад старшынствам тав. ЧАРВЯКОВА А. Г. адбудзецца ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ КАМІСІІ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕНЬНІ СЬВЯТКАВАНЬНЯ 10-ЦІГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІКАВАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

У ПАРАДКУ ДНЮ:

1. Даклад Вышэйшага Каапэрацыйнага Савету БССР аб працы па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня.
2. Даклад ОСО-Авіяхіму.
3. Даклад жаночага аддзелу ЦК КП(б)Б.
4. Даклад Наркамзему.

Для ўдзелу ў пасяджэньні таксама запрашаюцца прадстаўнікі рэдакцый газэт і грамадзкіх арганізацый.

Да збору сельска-гасп. падатку.

Вылічэньне сельска-гаспадарчага падатку ў БССР скончана, акладныя лісты разасланы. Дзякуючы выкрыцьцю ўсіх утоеных аб'ектаў і больш дакладнаму вучоту прыбытковасьці сельскае гасп., падатку налічана 10.925.000 руб.—на 13 проц. больш мінулага году. Скідкі і палёгкі рознага роду складуць да 2 млн. руб., і такім чынам, да плацяжу застанецца каля 9 млн. руб. Першая частка (30 проц.) гэтае сумы павінна паступіць да 1-га лістапада, а па аднэй трэці ўсіх сельсаветаў—на 20 дзён раней.

Хоць тэрмін яшчэ не канчаецца, але кампанію па збору сельска-гаспадарчага падатку трэба распачаць неадкладна. За летні пэрыяд на вёсцы сабраліся даволі значныя рэсурсы ад продажу сэзонных другарадных прадуктаў сельскае гаспадаркі: гародніны, садавіны, яек і інш. З такіх дробязяў падатак плоціцца заўсёды лягчэй. Часткаю таму, а часткаю з жаданьня адразу выканаць свае абавязацельствы, лепшая частка сялянства штогод уносіць падатак загадзя да тэрміну і поўнасьцю. Такія плацельшчыкі задаюць звычайна тон усей кампаніі, а ва імі цягнуцца іншыя. Вельмі часта на гэтым грунце разьвіваецца свайго роду спаборніцтва суседніх вёсак.

Няма сумненьня ў тым, што пагрозы інтэрвэнцыі, небясьпека мірнаму будаўніцтву Саюзу ССР толькі ўмацоўваць падатковую сьвядомасьць і дысцыпліну лепшай часткі вёскі. Калі кубанскія, паўночна-каўкаскія і ўкраінскія сяляне «у адказ Чэмбэрлену» цэлымі сельсаветамі да тэрміну ўносяць сельска-гаспадарчы падатак, то беларус, які паспрабаваў на сабе ўсе цяжкасьці інтэрвэнцыі і акупацыі, ня горш іх зразумее задачы фінансавае самаабароны і здолее выканаць свой абавязак перад краінай. Неабходна толькі развязаць яго ініцыятыву, стварыць умовы максымальнага спрыяньня датэрміновану ўносу сельска-гаспадарчага падатку. А для гэтага акруговыя і райённыя выканаўчыя камітэты павінны:

У самы кароткі тэрмін скончыць разгляд скаргаў плацельшчыкаў, даць усе палёгкі, разьмеркаваць скідачны фонд і ачысьціць падатковыя сьпісы ад маламоцных неплацежаздольных гаспадарак.

Неадкладна распачаць шырокую агітацыю за ўплату сельска-гаспадарчага падатку, кінуўшы ў масы сялянства лёзунг: **«Датэрміновы ўзнос сельска-гаспадарчага падатку—лепшы адказ ворагам СССР».** Пад гэтым лёзунгам трэба растлумачыць сялянству сэнс і задачы фінансавае самаабароны, падкрэсьліць ролю сельска-гаспадарчага падатку ў мясцовай гаспадарцы акруг і райёнаў, адзначыць напружанасьць нашага бюджэту і зьвязаную з гэтым неабходнасьць сваячасовага ўносу сельска-гаспадарчага падатку. Неабходна завастрыць агітацыю на тым моманце, што тэрмін, азначаны ў акладным лісьце, зьяўляецца канчатковым, і пасьля пачынаюцца налічэньні пені і ўжываньне рэпрэсій. Таму датэрміновая ўплата сельска-гаспадарчага падатку—у інтарэсах ня толькі дзяржавы, але і самога плацельшчыка.

Асаблівую ўвагу трэба надаць калектыўнай здачы падатку. Закон бягучага году прадстаўляе гэтаму спосабу ўплаты цэлы шэраг палегчаньняў і гарантый цэласьці здадзеных гэткім чынам сум. Неабходна ўсё гэта растлумачыць сялянству, падкрэсьліваць эканомію часу, непатрэбнасьць хадыбы ў РСІ г. д. Адначасова неабходна забясьпечыць выбар упаўнаважаных па калектыўнай здачы падатку з больш надзейных асоб, якія карыстаюцца давер'ем.

Само сабой зразумела, што касы ўсіх РВК павінны быць гатовы да прыняцьця любога разьмеру плацяжоў. Тэхнічныя сілы трэба разьлічыць на максымальна - магчымую колькасьць платнікаў, каб зьнішчыць стаяньне ў чарзе, нездаволенасьць і г. д.

Паўтараем, гутарка ідзе не аб прымушэньні, а толькі аб зьнішчэньні перашкод і аб палегчаньнях уплаты сельска-гаспадарчага падатку.

Уплата сельска-гаспадарчага падатку раней тэрміну павінна мець выключна дабрахвотны характар. Акрвыканкомы і РВК пры дапамозе ўсіх грамадзкіх сіл павінны неадкладна і шырока разгарнуць гэту кампанію.

АНТЫСАВЕЦКІ НАПРАМАК ПАЛІТЫКІ ЛІГІ НАЦЫЙ.

АБКРУЖЭНЬНЕ СССР ЛАНЦУГОМ ВЫКАНАЎЦАЎ ЗАГАДАЎ ЧЭМБЭРЛЕНА. ФІНЛЯНДЫЯ—СЯБАР РАДЫ ЛІГІ.

ЖЭНЁВА, 15-IX. Выбары пяталых сяброў рады Лігі Нацый замест Бэльгіі, Чэхаславаччыны і Сальвадора, далі наступныя вынікі: у раду выбраны Куба, за якую было пададзена 40 галасоў (агульны лік удзельнікаў галасаваньня—49), Фінляндыя, за якую пададзена 33 галасы, і Канада, за якую было пададзена 26 галасоў.

Што датычыць іншых дзяржаў, якія выстаўлялі свае кандыдатуры ў раду Лігі Нацый, дык за Грэцыю было пададзена 23 галасы, за Партугалію 16 галасоў, за Данію 2 галасы, за Уругвай 3 галасы, за Сіам, Швэйцарыю і Гаіці па адным голасе.

Па думцы жэнеўскіх палітычных колаў, новыя суадносіны сіл у радзе яшчэ больш узмацняюць уражаньне аб існаваньні антысавецкае тэндэнцыі ў палітыцы Лігі Нацый з прычыны абраньня Фінляндыі ў склад рады Лігі, бо гэтае абраньне адбылося, нягледзячы на заўвагу, што яно сустрэне няспрыяючую ацэнку з боку Савецкага Саюзу. Таксама падкрэсьліваецца, што ня было аніякае спробы абвергнуць антысавецкі характар кандыдаўры Фінляндыі.

У колах Нямецкае дэлегацыі зазначаюць, што ня гледзячы на распаўсюджаныя паведамленьні, Нямеччына не падтрымоўвала кандыдатуры Фінляндыі. Вынікі выбараў ацэньваюцца таксама, як значнае паслабленьне французкага ўплыву ў радзе і ўзмацненьне ангельскага ўплыву з прычыны выхаду са складу рады Чэхаславаччыны і Бэльгіі.

Як Ліга разьвязвае канфлікты.

ЖЭНЕВА, 15-IX. Рада Лігі Нацый ухваліла пастанову па пытаньні аб польскім вайсковым складзе на высьпе Вэстэрпляттэ ў Данцыскай гавані і па пытаньні аб транспарце зброі для Польшчы праз Данцыг.

У адпаведнасьці з думкаю камісіі юрыдычных экспэртаў Лігі Нацый, рада Лігі Нацый пастанавіла, што ранейшыя пастановы Лігі па гэтых пытаньнях могуць быць зьменены толькі ў выпадку падачы вестак аб новых фактах, прычым заявы аб новых фактах павінны падавацца камісару Лігі Нацый у Данцыскай вобласьці.

Пастанова рады Лігі азначае **адклад на няпэўны час абгавору скаргаў Данцыскае вобласьці, што выгодна для Польшчы.**

Мусульманскія краі абойдзены.

ЖЭНЕВА, 16-IX. У сувязі з выбарам новых непастаянных сяброў рады Лігі Нацый, старшыня пэрсідзкае дэлегацыі Форугі выказаў жаль адносна таго, што пратэнзіі мусульманскіх нацыяў на месца ў радзе ізноў ня былі ўзяты пад увагу. Форугі заявіў, што Пэрсія, пры бліжэйшай магчымасьці, ізноў будзе патрабаваць, каб далі ёй месца ў радзе Лігі.

Пагібель вялікага японскага параходу.

Затанула звыш 900 чалавек.

УЛАДЫВАСТОК, 15-IX. Пры пераходзе каля Курыльскіх выспаў, на шляху з Усьць Камчацку у Японію загінуў вялікі японскі пароход „Вузунг". Пароход ішоў з поўным грузам рыбных кансэрваў і вёз у Японію звыш 900 чалавек японскіх рабочых. Пароход належаў буйнай японскай пароходнай кампаніі „Кавасакі" і нядаўна пабудаваны. Зьмяшчае ён свыш 5 тысяч тон. Пароход патануў з усім грузам і людзьмі.

Расправа над карэйскім камуністычным рухам.

ТОКІЁ, 15-IX. 13-га верасьня ў Сэуле (Карэя) распачаўся працэс 101 карэйца, якія абвінавачваюцца ў арганізацыі камуністычнае партыі. Будынак суду абкружан драцянымі перашкодамі і ахоўваецца атрадам у тысячу паліцэйскіх.

На судзе прысутнічае 95 абвінавачаных, рэшта абвінавачаных хворыя. Абвінавачаных бароніць 26 адвакатаў, вылучаных для гэтае мэты арганізацыяй лібэральных адвакатаў.

Шаленая кампанія у Францыі за разрыў з СССР

ЦЫНІЧНЫЯ РАЗВАЖАНЬНІ ПРАВАЕ ПРЭСЫ.—ЛЕВАБУРЖУАЗНЫ ДРУК АСУДЖВАЕ ЦКАВАНЬНЕ СССР.

ПАРЫЖ, 15-IX. Ня слыняючы кампаніі за разрыў з СССР, орган Клемансо „Ом Лібр" зьмяшчае артыкул свайго рэдактара Лёцье, які піша: „Паколькі што Ракоўскі належыць да меншасьці партыі бальшавікоў, дык мы нічога не выйграем, калі яго заменіць які-небудзь прыяцель Сталіна, які будзе гаварыць і дзейнічаць яшчэ больш. Пытаньне ў тым, ці мы хочам замяніць савецкага пасла другім, баручы на сябе ўсю зьвязаную з гэтым рызыку, ці парваць адносіны, адноўленыя без здавальняючых гарантый. Урад павінен выбраць лепшы сродак забясьпечаньня нашае ўнутранае незалежнасьці і эканамічнае волі".

„Эко-дэ-Пары" падае далей гутаркі па пытаньні аб пажаданасьці разрыву з СССР. Дэпутат Анры Арыёль (дэмакратычны рэспубліканскі саюз) у адказе на анкету газэты заяўляе: „Калі да Расеі наогул мы павінны адносіцца падазрона, дык чырвоная Расея нам ненавісна. Ангельскі ўрад знайшоў у сабе адвагі парваць з ёю. Наш урад, як відаць, імкнецца да таго ж, але не асьмельваецца зрабіць гэты крок. Калі памылкова пушчаюць да сябе ў дом невядомага чалавека, дык яго проста выпіхаюць за дзьверы. Так зрабіла Англія, і так павінна зрабіць як мага хутчэй і Францыя".

„Журналь-дэ-Дэба", абгаварваючы артыкул „Известий" аб антысавецкай кампаніі ў Францыі, піша: „Камэрцыйныя аргумэнты гэтага артыкулу пазбаўлены ўсякага значэньня, бо саветы нічога ня купляюць. Таксама пазбаўлена ўсякага значэньня аргумэнтацыя гэтага артыкулу ў пытаньні аб даўгох, бо саветы ўсё роўна нічога ня плацяць.

„Котыдз'ен" піша, што ўсе рэакцыйныя сілы, падтрымліваемыя ўрадам, вядуць вераломную ў адносінах да Нямеччыны і СССР палітыку. У галіне замежных адносін гэтая палітыка вядзе да вайны, а ў галіне ўнутраных адносін яна вядзе лёгічна да мусалінізму".

„Пары Матыналь" зьмяшчае артыкул Лекаша, пад загалоўкам: „Наступ проці саветаў", Лекаш заявляе, што сучасная антысавецкая кампанія распачата без згоды Брыяна і накіравана таксама проці яго; водгук слоў Лекаша, гэтая кампанія распачалася як раз у дзень ад'езду Брыяна ў Жэневу. Лекаш заяўляе, што спрэчкі ў габінэце міністраў наконт інцыдэнту з Ракоўскім былі проста лоўкім манэўрам, які прымусіў усю Францыю паверыць, нібы Брыян згодзен з патрабаваньнем адкліканьня Ракоўскага. „Калі,—піша далей Лекаш—Брыян 17-га не падпіша патрабаваньня аб адстаўцы Ракоўскага, іншымі словамі аб разрыве з СССР, дык гэта можа прывесьці да падпісаньня адстаўкі яму самому".

Супроцьсавецкае выступленьне Мільлерана.

ПАРЫЖ, 15 IX. Мількеран, выступаўшы ў Алянсоне заявіў, што ўрад павінен ужыць адзіную меру, здольную нанесьці ўдар камунізму, гэта выдаць пашпарт савецкаму паслу і адклікаць прадстаўніка Францыі з Масквы.

«Гутарка ідзе не аб тым,—сказаў Мільлеран,—каб разыгрываць камэдыю, у якой прайграе Францыя, і вымагаць ад савецкаго ўраду замены Ракоўскага іншым прадстаўніком 3-го Інтэрнацыяналу. Адзіная сур'ёзная і вартая пастанова—гэта разрыў. Калі ўрад ня можа рашыцца зрабіць гэты акт, які-б прымусіў адступіць камунізм, дык гэта таму, што камуністычная партыя праз масы трымае ў руках сацыялістычную партыю, галоўны штаб якое ўжо ў працягу 3-х гадоў дыктуе законы партыі радыкал-сацыялістаў».

Паведамленьне агенцтва Вольфа.

БЭРЛІН, 15-9. Агенцтва Вольфа паведамляе: «З аўтарытэтных крыніц паведамляецца, што весткі, нібы нямецкае пасольства у Маскве ўзьдзейнічала на Чычэрына, у зьвязку з інцыдэнтам з Ракоўскім, не адпавядаюць сапраўднасьці».

ТАВ. ЛІТВІНАЎ АБ ФРАНКА-САВЕЦКІХ АДНОСІНАХ.

СУПРОЦЬСАВЕЦКАЯ КАМПАНІЯ ІНСЬПІРАВАНА БРЫТАНСКІМІ АГЕНТАМІ.—СПРАВА ІДЗЕ НЕ АБ ЗЬМЕНЕ САВЕЦКАГА ПАСЛА, А АБ ЛЁСЕ ФРАНКА-САВЕЦКІХ АДНОСІН.—РАЗРЫЎ ЯШЧЭ БОЛЬШ-БЫ ЗАВАСТРЫЎ ПАГРОЗУ ВАЙНЫ.

МАСКВА. Намесьнік Народнага Камісара па Замежных Справах тав. М. М. Літвінаў зрабіў прадстаўніком друку наступную заяву, у зьвязку з новаю фазаю, якую за апошні час набылі савецка-французкія адносіны:

Антысавецкая кампанія, распачатая цяпер у Францыі і нагадваючая, як па сваіх разьмерах, так і па прыёмах, антысавецкую кампанію ў Англіі, якая адбывалася напярэдадні перад разрывам савецка-ангельскіх адносін, прымушае думаць, што падрыхтоўка вайны нас над сабою базу, якая не абмяжоўваецца толькі межамі аднае Англіі. Толькі наіўныя людзі, ці сьвядомыя палітычныя ашуканцы могуць гаварыць, што антысавецкая кампанія ў Францыі накіравана асабіста проці нашага сучаснага паўнамоцнага прадстаўніка тав. Ракоўскага і выклікана яго надпісам пад вядомаю заявою апазіцыі. Тав. Ракоўскі сваёю дзейнасьцю ў якасьці паўнамоцнага прадстаўніка ў працягу 2-х гадоў ні разу не выклікаў нездаволеньня французкага ўраду.

Я лічу зусім непатрэбным спыняцца на інцыдэнце з подпісам тав. Ракоўскага пад заявою апазіцыі, бо гэты інцыдэнт вычарпан растлумачэньнямі, зробленымі тав. Чычэрыным і самім тав. Ракоўскім. Пан Эрбэт афіцыйна заявіў тав. Чычэрыну, што здаволены гэтымі растлумачэньнямі, і што пан Брыян таксама лічыць інцыдэнт скончаным. Апрача таго, французскаму ўраду вядома наша гатоўнасьць падпісаць у любы момант спэцыяльны пакт аб узаемным няўмешваньні ва ўнутраныя справы, хоць я павінен катэгарычна заявіць, што дзейнасьць савецкіх агэнтаў у Францыі ніякіх прытычак для патрабаваньня Францыяй такіх дакумантаў не давала.

Зусім яскрава, што гэты інцыдэнт зьяўляецца толькі прычынкаю для тых рэакцыйных колаў Францыі, якія стаяць сабе ва ўзьнятай кампаніі поўную мэту зрыву савецка-французкіх адносін і перамогу наконт згоды аб даўгох. Якраз гэтае пытаньне ўдалося ў самы апошні час вырашыць здавальняюча для французкае і савецкае дэлегацый, выпрацаваўшых схэму выплат СССР у 60 мільёнаў залатых франкаў, якімі скарысталіся-б мільёны ўласьнікаў расейскіх папер, у сучасны момант, страціўшых усю сваю вартасьць. Гэтая-ж схэма прадугледжвае крэдыты для фінансаваньня савецкіх заказаў французкім заводам, што паслужыла-б да пашырэньня рынкаў збыту для французкае-ж прамысловасьці. Гэтая-ж згода адчыняе далейшыя магчымасьці для гаспадарчага і палітычнага зблiжэньня абедзьвюх дзяржаў.

Не выпадковасьцю, значыцца, зьяўляюцца тыя абставіны, што антысавецкая кампанія распачата як раз на другі дзень пасьля дасягнутае згоды, бо гэтая кампанія ў першую чаргу, імкнецца сарваць намечаную згоду і потым ажыцьцёвіць антысавецкую палітыку Вялікабрытаніі ў Францыі. Не дарма частка французкае прэсы, называючы імёны, зазначыла, што антысавецкая кампанія французкае прэсы інсьпіруецца і распачата тымі самымі коламі, якія некалькі месяцаў назад ажыцьцёвілі англа-савецкі разрыў.

Няхай не гавораць нам, што гутарка ідзе толькі аб зьмене «віватага» паўнамоцнага прадстаўніка. Зараз вырашаецца лёс савецка-французкае канфэрэнцыі.

Я ведаю, ці разумеюць варожыя да нас колы і прыхільная да іх прэса, што як гэта даказана гісторыяй англа-савецкіх адносін, ні аб якіх згодах па пратэнзіях ці аб выплатах ня можа быць і гутаркі ў выпадку пагоршаньня, а, тым больш, спыненьня нармальных дыплёматычных адносін. Гэтыя колы, такім чынам, бяруць на сябе цяжкую адказнасьць таксама і перад сваімі землякамі — шматлікімі ўласьнікамі расейскіх каштоўных папераў. У Зах. Эўропе цяпер усім ясна, **што англа-савецкі разрыў стварыў страшэнную пагрозу ўсеагульнаму спакою, павялічыў і без таго напружанае міжнароднае становішча новымі небясьпекамі вайны. Франка-савецкі разрыў у яшчэ большай меры павялічвае разьмеры гэтых небясьпек.**

Вось чаму мы можам сьмела кваліфікаваць застрэльшчыкаў антысавецкае кампаніі ў Францыі, як падпальшчыкаў вайны, зачынішчыкаў сусьветнага пажару.

Мы ня трацім, аднак, надзеі на тое, што французкі ўрад выступае ня ў цэлым, і міралюбівая грамадзкая думка Францыі бачыць гэтыя небясьпекі і здалее перашкодзіць іх ажыцьцяўленьню».

Вакол падзей у Літве.

Расправы з удзельнікамі паўстаньня.

КОЎНЯ, 15-9. Па вестках міністэрства абароны, ваенна-палявы суд у Таўрогене скончыў разгляд справы яшчэ 7-мі ўдзельнікаў у непарадках, якія адбыліся ў Таўрогене. Адзін абвінавачаны прысуджаны да расстрэлу. Прысуд выкананы. Адзін апраўданы, рэшта прысуджаны на катаргу на розныя тэрміны.

Арышты ў Коўні.

КОЎНЯ, 15-9. Па вестках «Летувас Жыніос», у сувязі з здарэньнямі ў Таўрогене, у Коўні арыштавана 18 асоб.

ПОЎДЗЕНЬ КІТАЮ Ў АГНІ ПАЎСТАНЬНЯЎ.

КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯ НЯ Ў СІЛЕ ПРЫДУШЫЦЬ ВЫБУХ СЯЛЯНСКАГА БУНТУ.

Ваеннае становішча ў правінцыі Гуансі.

Арыштавана шмат прафсаюзных дзеячоў.

ШАНХАЙ, 15-IX. У Вучжоу (правінцыя Гуансі, недалёка Гуандунскае правінцыі) 6-га верасьня было абвешчана ваеннае становішча. На вуліцах Вучжоу зьявіліся шматлікія атрады ўзброенае паліцыі і салдат, якія рабілі вобыскі і ў праходжых.

7-га верасьня паліцыя ўчыніла наскок і вобыск у памяшканьнях усіх прафэсыянальных саюзаў, прычым арыштавала больш 200 прафсаюзных дзеячоў, западозрыўшы іх у арганізацыі камуністычнае змовы проці правінцыяльнага ўраду; каля 100 арыштованых хутка былі вызвалены, рэшта да гэтае пары знаходзіцца ў зьняволеньні. Ненаторыя прафсаюзы ў Вучжоу зачынены.

У зьвязку з выкрыцьцём на рэчцы Сі-цзян (на беразе якое знаходзіцца Вучжоу) лодкі са стрэльбамі і іншаю зброяю, у горадзе распаўсюдзіліся чуткі, што ў Вучжоу прыбыло шмат камуністаў, якія прывезьлі з сабою вялікую колькасьць ваеннае амуніцыі і падрыхтоўваюць рэвалюцыйны пераварот. Урад затрымаў шмат параходаў у Ганконг і Кантон і робіць вобыскі на ўсіх параходах.

Гуандунь у агні сялянскіх паўстаньняў.

Войска кантонскага дыктатара церпіць паражэньні.

ШАНХАЙ, 15—IX. Кітайская прэса Шанхаю адзначае, што кантонскі дыктатар Лі-Ці-Сін, сур'ёзна ўзяўся за абарону райёна Сватоў, дзела чаго паслаў туды дзьве лепшыя дывізіі. Ваенныя апэрацыі Лі-Ці-Сіна знаходзяцца ў цяжкім стане, водгук слоў кітайскага друку, дзякуючы таму, што сялянскія атрады падтрымоўваюць цесная супрацоўніцтва з войскам Іе-Ціна. У розных мясцох, нечакана ўзьнікаюць непарадкі і, такім чынам, урадавае войска часта заместа таго, каб наступаць, павінна абараняцца.

Дэклярацыя Лі-Ці-сіна.

ШАНХАЙ, 15-IX. Лі-Ці-сін агаласіў вялікую дэклярацыю наконт становішча, якое стварылася на поўдні Кітаю. «Паколькі і Нанкін і Ўхан ачысьцілі сябе ад камуністаў—гаворыцца ў дэклярацыі,—дык ніякіх разыходжаньняў між імі больш не павінна быць» Лі-Ці-сін далей адзначае «заслугі Чан-Кай-шы і заяўляе, што Чан-Кай-шы ўяўляе сабою правадыра, здольнага кіраваць народам у абставінах сучаснага крызісу; таму зьмена галоўнакамандуючага паўднёвым войскам вельмі нябыўмена».

У канцы Лі-Ці-сін прапануе да 4-га пленуму Гаміндану канчаткова вырашыць усе хваравітыя пытаньні, а таксама ўжыць усе захады, каб камуністы не вярнуліся да ўлады.

Забойствы з за вугла.

ШАНХАЙ, 15-9. Невядомаю асобаю забіты на вуліцы старшыня кантонскага саюзу маракоў Лі-Сяо-Нянь.

АРЫШТЫ КАМУНІСТАЎ У КАНТОНЕ.

ШАНХАЙ, 15-9. Згодна паведамленьня ганконскіх газэт, у Кантоне арыштован уплывовы прадстаўнік мясцовых радыкальных колаў Лю-Ю-Цьлян. Адначасна арыштавана 15 камуністаў.

Кампартыя ня спыняе працы.

ШАНХАЙ, 15-9. Кітайская прэса паведамляе, што ў Кантоне вельмі многа распаўсюджваецца праклямацыяў за подпісам гуандунскага камітэту партыі і інфармацыі аб перамогах армії Іе-Ціна, які набліжаецца да Кантону.

ШАНХАЙ, 15-9. Кантонскія кітайскія газэты паведамляюць, што камуністы захавалі за сабою кіруючы ўплыў у Гаміндансkіх арганізацыях і сялянскіх саюзах у райёне Гуайчжоу, адкуль накіроўваюць сваіх агітатараў у Кантон.

Паўстаньне проці Фынь Юй-сяна.

ШАНХАЙ, 15-IX. З Пекіну паведамляюць, што Чын-Юн-Ао атакаваў войска Фын-Юй-сяна ў райёне Лініна (у Хэнані, на Пекін—Ханькоўскай чыгунцы). Як перадаюць, войска Фынь-Юй-сяна, разьмеркаванае ў Сюйчжоу (у цэнтральнай частцы правінцыі Хэнані) адступае на поўнач.

ШАНХАЙ, 15-IX. Кітайскі друк агалошвае тэлеграмы з Пекіну, якія адхіляюць распаўсюджваемыя з японскіх крыніц чуткі, аб зьнішчэньні Фынь-Юй-Сянам дзесяткаў тысяч членаў арганізацыі «Чырвоныя пікі» і інш. Тэлеграмы абвяргаюць таксама чуткі і аб паўстаньнях супроць Фынь-Юй-Сяна.

Паўстаньне проці Ухану.

Разгром паўстанцамі ўрадавых войск.

ШАНХАЙ, 15-IX. Згодна паведамленьня вячэрніх газэт, высланы з Ханькоў уханскаю вайсковаю ўладаю ў раён Пучы (на паўдні правінцыі Хубей) атрад для прыдушэньня паўстанцкага руху пацярпеў паражэньне і з вялікім стратамі вярнуўся ў Ханькоў.

У Ўчане пачалі пабудоўку траншэй навокал гораду.

Дэмаралізацыя сярод уханскіх кіраўнікоў.

Адстаўка Ван-Цьзін-Вэя і Чэн-Гун-бо.

ШАНХАЙ, 15-9. «Мін-Го-Шы-Бао» агаласіла дэклярацыю Ван-Цьзін-Вэя, у якой ён, зьвяртаючыся да выканкому Гаміндану, абвінавачвае сябе ў тым, што позна пачаў барацьбу з камуністамі, што прывяло да такіх падзей, як паўстаньне Іе-Ціна і Хо-Люна. «З прычыны гэтага—заявіў Ван-Цьзін-Вэй—я павінен пайсьці ў адстаўку і чакаць суду над сабою. Прашу судзіць мяне з усёю строгасьцю закону, каб вывялася ступень маёй адказнасьці».

Адначасна з Ван-Цьзін-Вэем падаўся ў адстаўку член палітбюро ўханскага ЦК Гаміндану Чэн-Гун-бо, прызначаны старшынёю палітбюро пасьля ад'езду Ван-Цьзін-Вэя з Ханькоў ў жніўні 1927 г.

За дзень.

„Справа ідзе аб разрыве".

Гэтак зазначыў д'Монзі ў першы дзень, як французскім друкам была ўзьнята кампанія аб высылцы т. Ракоўскага з Францыі за яго подпіс пад заявай апазіцыі на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК. Кожнаму ясна было, што гэта зьяўляецца толькі прычынкай, каб разарваць зносіны паміж СССР і Францыяй. Зараз нашы меркаваньні пачынаюць апраўдвацца. Цэлы шэраг палітычных дзеячоў Францыі: Клемансо, Мільеран і інш. рашуча выступілі пытаньне, што як Францыя хоча выратаваць сябе ад камунізму, яна павінна пайсьці па шляху Чэмбэрлена.

Яшчэ ў часе паездкі французкага прэзыдэнта Думэрга ў Лёндан мы гаварылі, што Чэмбэрлен і тут атрымаў перамогу ў сэнсе таго, што Францыя пачынае згаджацца на яго супроцьсавецкую палітыку. Выпад Пуанкарэ—прам'ер-міністра Францыі супроць савецкага ўраду напярэдадні зачыненьня апошняга пасяджэньня палаты дэпутатаў, белымі ніткамі шыты працэс «камуністычных шпіёнаў», высылка кіраўніка французкага аддзяленьня ТАСС'а т. Браўна і ўрэшце ліст маршала Фоша, дзе ён заклікаў да крыжовага паходу супроць СССР,—ужо гаварылі нам аб тым, што рэакцыйныя колы Францыі, падбухтораныя Англіяй, рыхтуюць разрыў з СССР.

Нічуваным зьдзекам зьяўлялецца факт высылкі чужаземцаў з Парыжу нават без папярэдняга паведамленьня. Неабмежаваўшыся высылкай т. Браўна, міністр унутраных спраў Францыі Саро высылае таксама яго заступніка па французскім аддзяленьні ТАСС'а. Калі 25 год таму, пасьля кішынёўскага пагрому, пецярбургскі карэспандэнт „Таймса" д-р Рам, выкрыўшы пагромную дзейнасьць Плеве, надрукаваў у сваёй газэце ліст міністра да бэсарабскага губарнатара з прапановай не перашкаджаць «патрыятычнай» дзейнасьці чорнасоценных пагромшчыкаў, усемагутны Плеве не дазволіў сабе выслаць з Пецярбургу доктара Рама, а абмежаваўся толькі зьнішчэньнем абвяржэньня. У гэтым Саро пашоў далей царскага міністра Плеве.

Усё гэта гаворыць аб тым, што французкая рэакцыя ня спыніцца ні перад якімі мерамі для таго, каб выклікаць разрыў. Тэлеграмы, якія сёньня друкуюцца у газэце, сьведчаць аб тым, што за гэтую справу ўзяліся найбольш масьцітыя рэакцыянэры, як Клемансо і інш. Французкая рэакцыя хоча дабіцца свайго. Ня здолеўшы справакаваць нас, рэакцыя пайшла прамым мэтадам, патрабуючы поўнага і безумоўнага разрыву.

Зьезд нямецкіх прамыслоўцаў.

У вялікай залі франкфурцкай ратушы сабраўся зьезд нямецкіх прамыслоўцаў. Гэты зьезд мае ня меншае значэньне, чым чарговая сэсія рэйхстагу.

Ужо надворны выгляд зьезду дае некалькі цікавых рысаў. Багатая заля, а ў ёй банкіры, тузы прамысловасьці. Сярод гасьцей міністры—сучасныя, ранейшыя і будучыя, буйныя аграрыі, члены рэйхстагу і інш. Сярод іх старшыня ўсенямецкага аб'яднаньня прафсаюзаў—Лейпарт. Заля і будынак ратушы ўпрыгожаны ўсякімі кветкамі і зеляніной і... ніводнага сьцягу. Зараз у Нямеччыне адбываецца барацьба за рэспубліканскі ці імпэрскі сьцяг. Прамыслоўцы хочуць паказаць сваю нэйтральнасьць і таму ніякага сьцягу ня вывесілі, хоць амаль усе яны зьяўляюцца прыхільнікамі і падтрымліваюць барацьбу за манархічны сьцяг.

Гэтая нэйтральнасьць, імкненьне не вызначыць, вельмі заўважваецца на зьезьдзе. Прамыслоўцы хочуць паказаць, што без дапамогі ўраду яны самі дагаворацца з рабочай клясай ў тых пытаньнях, якія зараз стаяць перад нямецкай прамысловасьцю.

Нямеччына пачынае зноў выходзіць на замежны рынак. Для таго, каб мець магчымасьць вынаходзіць на пазыках і кантрыбуцыю, Нямеччыне трэба павялічваць свой вываз. Да гэтага часу нямецкая прамысловасьць узьнімалася за кошт здаваленьня ўнутранага рынку—сваіх спажыўцоў. Зараз вытворчасьць значна перавышае пакупную здольнасьць нямецкага рынку, дрэнных тавараў вывозіць за межы ня можна, бо іх ніхто купляць ня будзе. Таму перад нямецкай прамысловасьцю востра паўстала пытаньне аб павялічэньні якасьці тавараў і зьніжэньні цэн. Праведзеная рацыяналізацыя вытворчасьці не адбілася на зьніжэньні цэн, бо павялічаны прыбытак пайшоў у кішэні капіталістаў.

Вось чаму і ў 1927 годзе нямецкія прамыслоўцы прымушаны хаўрусьнічаць з прафсаюзамі, з лідэрамі рабочага руху для таго, каб пры іх дапамозе ўзьняць прадукцыйнасьць працы рабочых. Ужо ў прамове Бюхэра на тэму «Прадпрыёмцы, рабочыя і навука ў вытворчым працэсе» вельмі вызначылася падрыхтоўка наступленьня на заработную плату рабочых. **Бюхэр** гаварыў аб тым, што зарплата рабочых павінна залежаць ад узроўню цэн, і раіў рабочым памятаць, якія небясьпечныя вынікі можа мець павышэньне зарплаты, якое пазбаўляе прадпрыёмства канкурэнтнай здольнасьці. Другі прамоўца **Дюнсбэрг** зазначыў, што ў параўнаньні з налай прыбытковасьцю прадпрыемстваў, заработная плата завялікая.

Гэта штурхае прадпрыёмцаў на супрацоўніцтва з прафсаюзамі, каб пры іх дапамозе дамагчыся жаданых вынікаў. Спэцыяльна створаны пры дапамозе прафсаюзаў Інстытут Тэхнічнай Адукацыі рабочых мае мэтай, як зазначыў адзін з прамоўцаў—«ня столькі тэхнічную адукацыю, колькі выхаваньне рабочых тым духу, які дае магчымасьць уніканць непарадкаў і непаразуменьняў на прадпрыёмстве».

Лідэры рабочага руху, сацыял-дэмакраты яшчэ патрабны капіталістым для таго, каб яны садзейнічалі ім яшчэ больш пагоршыць умовы жыцьця рабочай клясы. Сацыял-дэмакраты ня раз капіталістаў выручалі. Не беспадстаўна яны на іх спадзяюцца і зараз.

Перад магчымымі ўздрыгамі.

Пасьля летняга заціішша ці справядлів

У АПОШНІ ЧАС.

— ПАРЫЖ. 16—IX. З правых газэт толькі „Фігаро" працягвае анты-савецкую кампанію. Левы друк усё больш і больш рашуча разьвівае кампанію супроць Франка-савецкага разрыву і супроць адкаёнаньня тав. Ракоўскага з Парыжу.

— ШАНХАЙ. 16—IX. Па паведамленьню афіцыйнага агэнцтва нанкінскага ўраду Го-Мінь, 18-я нанкінская армія прасунулася да Хайчжоу, які зьяўляецца апошнім ваярным пунктам Сун-Чуан-Фана ў паўночнай частцы правінцыі Цзянсу.

— ЛЕНІНГРАД. 16—IX. Скончана сьледзтва 5 манархістаў, сяброў арганізацыі Куцепава. Манархісты былі затрыманы ДПУ ў розных месцовасьцях Саюзу у час падрыхтоўкі да шэрагу тэрарыстычных актаў, накіраваных супроць адпаведных савецкіх працаўнікоў. Да суду перададзены тэрарысты Балмасаў, Сольскі, Страны, Самойлаў. Адэйран.

— СЕВАСТОПАЛЬ. 16 верасьня раніцаю ў Яяце адбыўся новы штуршок значнай сілы. У Еўпаторыі мэтэаралёгічная станцыя адзначыла каля 1 гадз. ночы шэраг нязначных уздрыгаў, а затым між 10 і 11 г. раніцы адбыўся значны штуршок працягам у 4 сэкунды. Выезд курортнікаў, як і раней, вялікі. Панікі няма. Пры Крымскім ЦВК складзена ўрадавая камісія па аказаньні дапамогі пацярпеўшым.

ПАРЫЖ, 15-9. Агенцтва Гавас паведамляе: «З прычыны спрыяючых адносін Францыі да прапановы Злучаных Штатаў пачаць перамовы аб падпісаньні гандлёвага ўгавору, француская ўлада, у мэтах праяўленьня добрых адносін, ухваліла да часу адчыненьня перамоў зьнізіць часова на 50 проц. мыты (пошліны) на некаторыя амэрыканскія тавары, наперад да ўтварэньня канчатковага дагаварэньня».

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ

ЦЯЖКІЯ ВЫНІКІ ЗЕМЛЯЗДРЫГУ Ў КРЫМЕ.

Заклік крымскага ЦВК.

СЫМФЭРОПАЛЬ, 15-IX. Крымскі ЦВК зьвярнуўся да дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый, рабочых і сялян з наступным: «Землязьдрыг учыніў вялікія шкоды. Яны асабліва вялікія на па паўдневым беразе Крыму, дзе няма ні аднаго гораду, вёскі, мястэчка, якія ў той, або другой ступені не пацярпелі ад землязьдрыгу. Дзесяткі дамоў зусім разбураны, сотні разбураны на палову, або патрэскаліся, вялікая колькасьць будынкаў стала непагодная для жыцьця. Насельніцтва пацярпеўшых райёнаў жыве на вуліцах, у садох, парках і палёх. Яго становішча цяжкае. Неабходна тэрмі новая дапамога пацярпеўшым.

Крымскі ЦВК заклікае ўстановы, арганізацыі, рабочых і сялян—зараз-жа распачаць арганізацыю дапамогі пацярпеўшаму насельніцтву і ўтварэньне грашовых фондаў, неабходных дзеля ліквідацыі выпікаў землязьдрыгу.

ЗАБІТЫЯ І ПАРАНЕНЫЯ Ў ЧАС ЗЕМЛЯЗДРЫГУ.

СІМФЭРОПАЛЬ, 15-9. Сярод забітых у часе землязьдрыгу пазнана **Аўчыньнікава**, член ленінградзкае партыйнае арганізацыі.

Цяжка паранены: **Натальля Шалыгіна**, 23 гадоў з вёскі Рыбіцы, Арэнбурскае губ., **Аляксандра Якубовіч**, 37 гадоў з Растова-Дону, супрацоўніца Волга-Донскага будаўніцтва, **Рыгор Каратаеў**, 28 гадоў чырвонаармеец **з Бабруйску, Базыль Аленін**, 34 гадоў, загадчык сілавымі ўстаноўкамі Лучкінскага цукровага заводу, Іванава-Вазьнясенскае губ., **Якуб Саенка** 36 гадоў, **Навум Гарамыкін**, 24 гадоў з вёскі Грачава, Бранскае губ. і інш.

Новыя штуршкі ў Сэвастопалі.

СЭВАСТОПАЛЬ, 16-IX. Сёньня, а 10 г. 26 хв. раніцы адчуваўся штуршок у 4 балы. Насельніцтва многіх дамоў павыбягала на вуліцу. Штуршок адбываўся з хвалёваю трасянінаю.

У Балаклаве зноў адхлынула вада.

* * *

СІМФЭРОПАЛЬ. У Сімфэропалі, Севастопалі і Балаклаве ноччу перад 15-м верасьня адчуваліся лёгкія штуршкі, якія ня выклікалі ніякіх зруйнаваньняў. Жыхарства наступова супакойваецца. Ад'езд курортнікаў пакуль-што значны. Крымскія ўрадавыя ўстановы разгортваюць шырокую працу па аказаньні дапамогі пацярпеўшым ра ёнам.

Водлуг апошніх вестак, недалёка Ялты зруйнавана станцыя аховы расьліў.

Учора ў 10 гадз. увечары ў Эўпатарыйскім райёне пранесься моцны гураган, які нарабіў шмат шкоды.

Ненадрукаваныя прамовы Ул. Леніна.

ЛЕНІНГРАД, 16-IX. Губіспартам знойдзены новыя, яшчэ не друкаваныя прамовы Ул. Іл. Леніна. Гэтыя прамовы былі сказаны Ўладзімірам Ільлічом 28 кастрычніка 1927 г. (па старому стылю) на насяджэньні палкавых дэлегатаў Петраградзкага гарнізону.

Першы розыгрыш 3-е сялянскае пазыкі.

МАСКВА, 14-9. 15-га верасьня, у станіцы Славянскай (Паўночна-Каўкаскага краю) пачынаецца першы тыраж 3-яе сялянскае пазыкі. У тыражы будзе разыграна 175161 выйгрыш на суму 1875 тысяч руб. У ліку выйгрышаў адзін—у 5 тысяч руб. дзесяць—па 2 тысячы руб., 50 па тысячы руб., 100—па 500 руб. і 175 тысяч выйгрышаў—па 50 руб.

Падпіска на пазыку індустрыялізацыі.

МАСКВА. З посьпехам праходзіць папярэдняя падпіска на аблігацыі пазыкі індустрыялізацыі. У Ленінградзе за сёньнешні дзень падпісана на 1 мілён сто тысяч руб. На маскоўскай таварнай біржы за 15 верасьня прададзена аблігацый на паўтара мільёны руб.

Аб пасьпешнай падпісцы паведамляюць таксама і з іншых гарадоў.

МАСКВА, 14-9. З 16-га верасьня папярэдні продаж пазыкі індустрыялізацыі будзе адбывацца на новых умовах: кошт аблігацыі павышаецца з 23 руб. 50 кап. да 23 р. 75 кап.

Вынікі Ніжагародзкага кірмашу.

НІЖНІ-НОЎГАРАД. Сёньня зачыніўся Ніжагародзкі кірмаш. Зварот кірмашу перавысіў леташні і дасяг 190 мільёнаў руб. Усе завезеныя на кірмаш тавары прададзены поўнасьцю.

У кірмашы брала ўдзел 368 чужаземных фірмаў, пераважна пэрсідзкіх і кітайскіх.

Посьпех 2-хтыднёвіка ашчаднасьці.

МАСКВА. Сёньня ў Маскве распачаўся ўсесаюзны «двухтыднёвік ашчаднасьці». Наведваньне маскоўскіх кас ашчаднасьці ў гэты дзень павялічылася больш, чымся ў два разы. Нагладаецца пачаўшы новых укладчыкаў. У Ленінградзе распачалася выдача скарбонак укладчыкам. Запыт на скарбонкі такі вялікі, што касы ашчаднасьці ня маюць магчымасьці задаволіць на попыт іх. Штодзённа манэтны двор выпускае 1250 скарбонак, частка якіх рассылаецца па Саюзе.

Аб пасьпешным ходзе двухтыднёвіка ашчаднасьці паведамляюць з шэрагу іншых гарадоў.

ЗА ВЫРАТАВАНЬНЕ СПАДЧЫНЫ СУН-ЯТ-СЭНА АД ПАЛІТБАНКРОТАЎ.

УСЁ РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ Ў ГАМІНДАНЕ ПАВІННА АБ'ЯДНАЦЦА ВАКОЛ СУН-ЦЬЗІН-ЛІН.

Заява Аўніня Чэна.

МАСКВА, Равейны міністр замежных спраў нацыянальнага ўраду Чэн-Ю-Жэн (Аўнінь Чэн) зрабіў у Маскве прадстаўніку ТАСС наступную заяву, якая вызначае яго адносіны да апошніх падзей у Кітаі.

«Я выехаў з Кітаю на падставе пастановы прэзыдыуму палітбюро ЦК Гаміндану ва Ўхане, потым зацьверджанае на пасяджэньні палітбюро у якасьці міністра замежных спраў нацыянальнага ўраду, маючы даручэньне ад гэтага ўраду. Аднак, сур'ёзныя зьмены, багатыя грозьнымі вынікамі для будучыні, пазбаўляюць мяне магчымасьці далей устрымлівацца ад катэгарычнае заявы, што нацыянальны ўрад, як рэальны палітычны фактар, спыніў сваё існаваньне. Здрадніцтва, распачатае нанкінскімі мілітарыстамі і іх прыхільнікамі і ў выніку законнае ўханскімі мілітарыстамі і палітычнымі дзеячамі, зьяўляецца ня толькі контр-рэвалюцыйным актам, а па сутнасьці вайсковым пераваротам, які зьнішчыў нацыянальны ўрад і паклаў канец славутнаму пэрыяду рэвалюцыі ў Кітаі.

Гаміндан узьняў міжнародзнае значэньне Кітаю да узроўню які ня мае сабе прыкладаў у гісторыі Кітаю, і прымусіў вялікія дзяржавы гаварыць з міністрам замежных спраў нацыянальнага Кітаю, як з роўным. Усяго толькі некалькі месяцаў назад да Гаміндану адчувалі нянавісьць і нават жах, але ніхто не асьмельваўся адносіцца да яго з пагардай. Зараз становішча іншае. Ніхто больш не баіцца Гаміндану і не паважае яго.

Чым растлумачыць такую вострую зьмену ў адносінах да Гаміндану? Прычыну трэба шукаць у чорнай працы рэакцыі і контр-рэвалюцыі ў Кантоне, Нанкіне і Шанхаі у Чанша і інш. пунктах правінцыі Хунані, а ў апошні час таксама і ў Ухане. Ва ўсіх гэтых мясцох адбываліся бязьлітасныя забойствы сялян і іх лідэраў, рабочых і іх лідэраў, таварышоў кітайскіх камуністаў і іх лідэраў, рабіўшых усё, што было ў іх сілах, каб дапамагчы Гаміндану дасягнуць і заўладаць лагчынаю рэчкі Янцзы, а нашы расейскія прыяцелі, усімі сіламі дапамагаўшыя Гаміндану, тыя прыяцелі, якія ў будучым—калі іх здолеюць справядліва ацаніць—заслужаць удзячнасьці за аказаныя імі нацыянальнаму ўраду паслугі, прымушаны былі пакінуць Кітай, таму, што дробныя палітыканы—прыслужнікі новага мілітарызму ў лагчыне рэчкі Янцзы пастанавілі, што самі здолеюць ажыцьцёвіць грандыёзныя задачы рэвалюцыі.

Гэтыя палітычныя камісіянэры з Панкіну і Ўхану вядуць цяпер імем сваіх ваенных гаспадароў перамовы аб заспаканьні, у якасьці асновы новага ладу, такое дзяржаўнае сыстэмы на старым фэадальным узоры, якая нічым не адрозьніваецца ад органаў кіраўніцтва пекінскага бандыта, адкрыта ажыцьцяўляючага фэадальную автократыю. Але іх лёс будзе такім-жа, як і іх папярэднікаў, якія спрабавалі кіраваць краем такім-жа чынам.

Аднак, ні ў якім выпадку нельга дапусьціць, каб спадчына, пакінутая народу Сун-Ят-Сэнам, загінула ў той катастрофе, якая нямінуча чакае новых мілітарыстаў. Сапраўдныя пасьлядоўцы памёршага настаўніка павінны аб'яднацца навакол сапраўднае выявіцельніцы яго ідэй—Сун-Цьзін-Ліп і самым рашучым чынам змагацца проці давядзеньня сапраўднага Гаміндану да ўзроўню сэкратарыяту таго нэо-дудзюнака, які зараз нараджаецца на тэрыторыі на Янцзы, і проці здрадніцтва і інтрыг палітычных банкротаў, якія імкнуцца пазбавіць рэвалюцыю яе матар'яльных і маральных заваёў.

ПОЛЬСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ ПАД АБСАЦАМ ПІЛСУДЗКАГА.

БЯСЬСІЛЬЛЕ БУРЖУАЗНЫХ ПАРЛЯМАНТАРЫЯЎ УЗЬДЗЕЙНІЧАЦЬ НА ЎРАД.

ВАРШАВА, 15-IX. Пытаньне аб павестцы дню надзвычайнае сэсіі палаты (г. сн. сэнату і сойму) ня спыняе служыць прадметам разгалосьоў між партыямі. ППС, пры падтрыманьні старшыні сойму Ратая, дамагаецца, каб сэнат ухваліў у першую чаргу закон аб самароспуску палаты. Сваё патрабаваньне ППС матывуе тым, што ўрад можа пажадаць, наперакор канстытуцыі, прадоўжыць паўнамоцтвы парляманту сучаснага складу.

Правая апазіцыя дамагаецца ў першую чаргу перагляду выбарчага закону, проці чаго пратэстуе ППС.

Польскі друк ажыўлена абгаварвае абцяжаранае становішча. Орган ППС „Роботнік" патрабуе „ліквідацыі фікцыі: „ні дыктатура, ні дэмакратыя". Газэта ня ўпэўнена ў тым, ці будзе ўрад адносіцца з большаю пашанаю да сойму новага складу, і патрабуе адказу на запытаньне, які зараз палітычны лад у Польшчы.

Орган эндэкаў „Газэта Варшавска Поранна" лічыць магчымым новы канфлікт між соймам і ўрадам. Па думцы газэты, урад праз некалькі дзён ізноў зачыніць сэсію сойму. Газэта, аднак, заклікае палату „выканаць свае абавязкі" і ўскладае на ўрад адказнасьць за выніні канфлікту.

„Кур'ер Польскі" паведамляе, што правыя партыі прапануюць ППС падаць агульны вотум недавер'я ўраду, але ППС хіляецца адказваць на гэтую прапанову.

Проці сойму, у асаблівасьці проці Ратая вядуць узмоцненую кампанію газэты „Эпока" (афіцыёз) і „Глос Правды" (орган пілсудчыкаў). Урадавыя газэты заяўляюць, што сойм затрабаваў скліку сэсіі не для станоўчае працы, а для дэманстрацыі проці ўраду. „Глос Правды" наконт гэтага піша: „У гэтых умовах урад будзе прымушан перашкодзіць гэтай задачы, хоць-б яго падахвочваў старшыня сойму.

Орган вайсковага міністэрства „Польска Збройна" радзіць ураду ўжыць рашучыя меры.

Аб магчымасьці канфлікту між урадам і соймам сьведчыць таксама надыходзячы прыезд у Варшаву Пілсудзкага.

Паход на нямецкую кампартыю.

Блізкі суд над членамі ЦК кампартыі.

БЭРЛІН, 15-9. Крымінальная калегія Лейпцыскага трыбуналу прызначыла працэс членаў ЦК нямецкае кампартыі на 4 кастрычніка. Па гэтай справе прыцягнуты таварышы: Фрэліх, Гэкерт, Капэн, Рэмеле, Ліндау, Пфэйфер, Шмідт, Штэкер і Шуман. Усе яны абвінавачваюцца ў падрыхтоўцы дзяржаўнае здрады і ў парушэньні закону аб абароне рэспублікі.

«Ротэ Фана» піша, што прызначэньне працэсу ў цяперашніх абставінах роўна абвяшчэньню паходу супроць рэвалюцыйных рабочых мас і супроць Савецкага Саюзу». «З дапамогаю хлусьні, сфабрыкаванае пракурорам Ніднэрам—піша газэта—у Нямеччыне хочуць узбудзіць пагромныя настроі супроць рэвалюцыйных рабочых мас і першае ў сьвеце рабочае дзяржавы.

Па Беларускай ССР.

Да „Дню ўраджаю".

«Дзень ураджаю»—дзень падрахунку вынікаў сельска-гаспадарчага году. Сялянства горача рыхтуецца да сьвяту ўраджаю.

«Дзень ураджаю» з кожным годам зацікаўлівае ўсе большыя і большыя колы сялянства. Сялянства Бабруйшчыны сёлета лепей ад мінулых год рыхтуецца да правядзеньня гэтага сялянскага сьвята.

На месцы ўжо даўно распачата праца па падрыхтоўцы. Агранамічным пэрсаналам на мясцох падводзяцца вынікі сельска-гаспадарчых вопытных вучастка ў, зьбіраюцца выставачныя экспанаты.

Сялянства ў сваю чаргу зьбірае свае дасягненьні, каб прадэманстраваць іх у «Дзень ураджаю» перад усім сялянствам.

Для шырокай папулярызацыі дасягненьняў сельскай гаспадаркі, у кожным райёне будзе арганізавана сельска-гаспадарчая выстаўка. У некаторых райёнах выстаўкі будуць утвораны ў некалькіх частках райёну паасобку. Гэтае мерапрыёмства дасьць магчымасьць большаму ліку сялянства наведаць выстаўкі.

Сяголетнія выстаўкі маюць асаблівыя адзнакі супроць выставак мінулага году. Сяголета на выстаўках **арганізоўваецца конкурс па лепшы бурак.**

На прэміраваньне буракоў вызначаны спэцыяльныя сродкі.

На выстаўках за летныя экспанаты будуць выдавацца прэміі грашыма і натураю.

На мясцох ідзе шпаркая падрыхтоўка да гэтага сьвята. Сваячасовае яе распачынаньне гаворыць за тое, што і само сьвята ўраджаю будзе праведзена добра, зьвяціцца шырокай масавай сялянскай урачыстасьцяй.

А. Дамброўскі.

Бабруйск.

РОСТ МАЛОЧНАЙ КААПЭРАЦЫІ Ў АРШАНШЧЫНЕ.

Белсельсаюз выявіў капчатковыя вынікі разьвіцьця малочнай каапэрацыі ў Аршанскай акрузе за апошні год.

Вось скуткі даннай дзейнасьці: **16 сырамасларобных заводаў далі прадукцыі кала 3.000 пуд.** (каштоўнасьцю ў 60.000 руб.). Апроч таго, пабудавана 3 тыповыя (удаскапаленыя) заводы ў Стайках, Трылессіне і Лагоўшчыне.

На ўсю гэту справу было адпушчана Белсельбанкам крэдыту—72.530 р.

Якасьць прадукту аказалася вельмі здавальняючаю.

Праз малочныя арцелі хлынулі хваляю ўгнаеньні і насенны матар'ял узорнага гатунку.

Сялянства акругі надзвычайна цікавіцца малочнай каапэрацыяй, бачачы ў ёй адзін з моцных штырхачоў да ўздыму гаспадаркі.

М. В—аў.

КУЛЬТУРНА-АСЬВЕТНАЯ СЕТКА ШЫРЫЦЦА.

Мазыр. Членамі гарсавету сумесна з працаўнікамі Акраіна зроблен агляд усіх культурна-асьветных устаноў г. Мазыра. Агляд меў характар азнаямленьня з недахватамі ў праны вышэйпаказаных устаноў і з станам працы ў іх.

У 1927 годзе з 7-мігодак выпушчана 88 чалавек і 4-хгодак—41 чалавек.

Селста былі адчынены два дзіцячыя сады, можна сказаць, што яны сябе апраўдалі. У гэтым годзе быў выпуск вячэрняй школы павышанага тыпу ў ліку 29 чалавек, школы рабочай моладзі—31 чалавек і прафшкольнаў дрэваапрадоўнікаў — 31 чалавек. У горадзе сямігодак поўных—4, чатырохкамплектных школ—2 і 1 аднакамплектная школа. Усяго камплектаў—46, з іх I канцэнтру 27 і II канцэнтру 19. Апроч таго, дзьве пулявыя групы.

Дашкольных адзінак маецца: дзіцячых садоў—2, пляцовак было 11. Дзіцячых дамоў маецца—3: 1 беларускі і 2 яўрэйскія.

Усяго вучняў у школах 1723 чалав.

Адначасова з дасягненьнямі, якія мы маем у параўнаньні з мінулымі гадамі, неабходна адзначыць і недахваты, на якія трэба зьвярнуць увагу ў зьвязку з станам новага бюджэту: адсутнасьць памяшканьняў пад школы, у школе для дарослых няма патрэбнай колькасьці кніг. Апрача таго, неабходна адчыніць 4 ты курс пры школе для дарослых.

У працы дзіцячага гарадка таксама шмат недахватаў. Неабходна некаторых настаўніц замяніць новымі.

Х. С-н.

ГАТУНКОВАЕ НАСЕНЬНЕ СЯЛЯНАМ.

Гомель. Гомельская кантрольна-насенная станцыя правяла апрабацыю (іспыты на засьмечанасьць) усіх гатунковых насеваў на корані на плошчы ў 2.500 дзес. Па дадзеных праведзенай апрабацыі ў акрузе на пасёлках і ў калгасах (акрамя савгасаў) у гэтым годзе маецца каля 20 тысяч пуд. лішкаў гатунковага аўса «залаты дождж». Гэты авёс будзе загатаўляцца праз нізавую сетку с.-г. каапэрацыі для здавальненьня насельніцтва насеўным матар'ялам у час вясеньняй сяўбы. Загатоўка аўса пачнецца ў хуткім часе.

БІБЛІЯТЭКІ ДА КАСТРЫЧНІКА.

Віцебск, 15. На насяджэньні аб'яднаньня бібліятэчных працаўнікоў распрацаваны пытаньні ўдзелу гарадзкіх бібліятэк у сьвяткаваньні Кастрычніка. У бібліятэках будуць вывешаны спісы кніг к Кастрычніку. Бібліятэчныя працаўнікі прымуць удзел у дэманстрацыі асобнай арганізацыяй.

ДА УСЕСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯН—СЯБРОЎ САВЕТАЎ.

БАБРУЙСК, 15-9. З 18 верасьня акрузе распачынаецца правядзеньне сельскіх і местачковых сходаў работніц і сялянак—сяброў саветаў па падрыхтоўцы да ўсесаюзнага зьезду работніц і сялянак—сяброў саветаў. Райённыя зьезды працягнуцца з 27 верасьня да 2 кастрычніка.

Сходы будуць праводзіцца пры шырокім удзеле жанчын-дэлегатак і жаночага актыву.

СПАБОРНІЦТВЫ СЯЛЯНСКІХ КОНЯЙ.

Гомель, 15. Акрэа арганізуе пры гомельскім конзаводзе акруговыя спаборніцтвы сялянскіх коняй на жвавасьць. За лепшых коняй будуць дадзены прэміі. Усяго маецца 11 прэмій на 220 рублёў.

Перад юбілеем Кастрычніка.

Праца распачалася.

(Клюб скуранікоў).

Падрыхтоўчая праца да сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі клюбам скуранікоў ужо распачата.

У першую чаргу рамантуецца самы будынак клюбу: адбываецца перапляніроўка пакояў, навялічваецца сцэна і г. д. Урачыстае адчыненьне клюбу прыстасоўваецца да сьвята Кастрычніка. Ужо рыхтуецца інсцэніроўка ў 4-х актах на яўрэйскай мове, якая напісана ўдзельнікам драмгуртка клюбу. Духавы аркестр клюбу рыхтуе новы рэвалюцыйны рэпэртуар.

Спартыўныя гурткі клюбу рыхтуюцца да фізкультурных выступленьняў на дэманстрацыі.

Для азнаямленьня шырокіх мас саюзу скуранікоў з гісторыяй і значэньнем Вялікага Кастрычніка праўленьне клюбу рассылае па фабрыках і заводах сьпісы кніг і матар'ялаў, прысьвечаных юбілею Кастрычніка.

Для больш шырокага і грунтоўнага азнаямленьня сяброў саюзу скуранікоў з юбілеем Кастрычніка, праўленьне клюбу мае правесьці па прадпрыёмствах цэлы шэраг гутарак на тэмы: «Кастрычнікаўскі пераварот», «Грамадзянская вайна», «Рэха Кастрычніка заграніцай» «10-ты год» і г. д. У часе сьвята будуць наладжаны 2 ранішнікі для дзяцей рабочых.

Дзеля таго, каб уцягнуць у сьвяткаваньне 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі як мага больш рабочых, розныя гутаркі, чыткі і даклады будуць весьціся на нацыянальных мовах.

Школы М-Б-Б чыг. рыхтуюцца да сьвята.

У Менскіх школах М-Б-Б чыгункі з 15-га верасьня пачалася падрыхтоўчая праца да сьвяткаваньня 10-цігадовага юбілею Кастрычнікавай рэвалюцыі.

У плян клясных заняткаў уводзіцца вывучэньне пытаньня аб дасягненьнях у сацыялістычным будаўніцтве за 10 год і аб нашых задачах у далейшым.

Клюбная праца будзе аб'яднана агульнай комплекснай тэмай «Кастрычнік і яго заваёвы».

Усе гурткі будуць працаваць над праработкай яе, а таксама спэцыяльных заданьняў.

К сьвяту выйдзе насьценная газэта на чатырох дзяржаўных мовах БССР.

На сходзе чыгуначнікаў-бацькоў будзе зроблен даклад «10 гадоў будаўніцтва Савецкай Школы».

Юбілейныя падарункі.

(Бабруйшчына).

Да дзесяцёхгодзьзя Кастрычніка вёска падводзіць вынікі свайго гаспадарчага будаўніцтва, рыхтуе свае юбілейныя падарукі.

Гэтых падарункаў багата. Кожны сельсавет, кожная вёска нават самага глухога куточка акругі мае права заявіць аб сваіх дасягненьнях у культурным і гаспадарчым будаўніцтве цьвёрда:

— Што гэтыя дасягненьні будуюць замацованы, і вёска пойдзе да новых дасягненьняў.

І сяляне заяўляюць... Так, сяляне Клічаўшчыны гавораць аб тым, што да рэвалюцыі ў райёне існавала толькі 13 школ, а зараз іх налічваецца 37. Цяпер у райёне працуе 2 хаты-чытальні, народны дом, лікпункты і г. д.

Заяўляючы аб гэтым, сялянства гаворыць:

— Раней мы сядзелі ў цемры векавечнай.

Дый ня гэтым адным можа пахваліцца Клічаўшчына. Савецкая ўлада пабудавала ў райёне новы ўрачэбны вучастак, адчыніла фэльчарскі пункт, правяла землеўпарадкаваньне ў шмат якіх вёсках.

У дадатак да гэтага ў райёне працуюць цяпер тры «сталёвыя кані»—трактары.

Ці было гэта раней? Ці бачыла сялянства працу трактара на сваіх палёх? Не, не і не...

А вось і другі—Жыліхаўскі сельсавет падлічвае свае гаспадарчыя навіны за час існаваньня савецкае ўлады. Іх шмат. У вёсцы Жыліхаве пабудован тыповы будынак сельсавету, будуецца памяшканьне над школу, пабудована новае пажарнае дэпо. Гэтае дэпо пабудована сіламі і сродкамі саміх сялян. Сяляне не пашкадавалі сілы і працы для палепшаньня свайго дабрабыту.

Вёска Гулевічы таго-ж сельсавету мае новае памяшканьне пад школу; у вёсцы Выгадзе будуецца грамадзкая кузьня.

А каля вёскі Ясень, Асіповіцкага райёну, будуецца грамадзіна—школа. Хутка гулам загудуць сялянскія дзеці ў гэтай школе. Яна здолее абслужыць ня толькі вёску Ясень, а суседнія вёскі.

Хіба гэта не дасягненьні?

Праўда, гэта толькі кропля тых юбілейных дасягненьняў, якія мае вёска Бабруйшчыны, але гэта гаворыць аб тым што:

«Толькі савецкая ўлада можа правільна вырашаць пытаньні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва»,

што вёска з году ў год расьце, што мацнее і шырыцца сапраўднае **савецкае будаўніцтва.**

А. Дамброўскі.

Хроніка падрыхтоўкі да Кастрычніка.

ЗІМОВАЯ ПЛЯЦОЎКА ПІАНЭРАЎ.

Наркамздраў рыхтуе да сьвяткаваньня 10-хгадовага юбілею Кастрычнікавай рэвалюцыі адчыненьне зімовай пляцоўкі для піанэраў.

КНІЖНАЯ ВЫСТАЎКА.

У дні Кастрычніка Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва мае наладзіць на адным з гарадзкіх пляцоў выстаўку кніг і газэт, якія выйшлі ў БССР за 10 год пасьля Кастрычніка.

Вестні адусюль.

Дарагая інстытуцыя.

Агульны бюджэт Лігі Нацый на 1928 год раўняецца 24.879.622 франкам. З гэтай сумы 12.429.000 прыпадае на сэкратарыят, 7.904.000 на міжнародную арганізацыю працы, 2.177.000 на сталы міжнародны мірны трыбунал. Кошты ўсіх камісій і канфэрэнцый, падарожжа ўрадоўцаў і спэцыялістаў—1.818.000 франкаў.

Прадгістарычныя грабоўцы.

Каля вёскі Окуп, Ласкага павету, у Польшчы знойдзены ў часе капаньня равоў прадгістарычныя грабоўцы. Яны збудованы з каменьня, маюць каменныя урны і прыкрыты каменнай плітою

13 мільёнаў даляраў штрафу.

Нядаўна адзін амэрыканскі нафтавы король Дагэны заплаціў 13 мільёнаў даляраў штрафу за тое, што незаконным спосабам набыў нафтавыя палі.

Сучасны герастрат.

Нейкі Рай Марсдэд, які сядзіць у вастрозе ў штаце Огіё, сазнаўся, што ён спаліў 18 касьцёлаў у Канадзе.

Астрог за абарону ад нападу фашыстаў.

БЭРЛІН, 13-9. Эсенскі суд прысудзіў 12 сяброў чырвонага саюзу франтавікоў у агульным ліку да 8 з паловаю гадоў турмы, за ўдзел ў стычцы з мясцоваю арганізацыяю фашысцкага саюзу Сталёвы Шлем.

Землязьдрыг у Турцыі.

АНГОРА, 13-9. Ночу з 11 на 12 ў Трапэзундзе, Сінопе і Канстантынопалі было адчувана пасьля паўночы некалькі падзённых штуршкоў. У Канстантынопалі штуршкі цягнуліся 20 сэкунд. Ахвяр няма.

Лётчык Шастакоў у Благавешчанску.

БЛАГАВЕШЧАНСК, 15-9. Лётчык Шастакоў, прыляцеўшы з Хабароўску, паведамляе, што яго ў дарозе захапіў моцны гураган і ён быў прымушаны ляцець вельмі нізка над самай зямлёю. Лётчык вельмі стаміўся.

З Благавешчанску ў Чыту ён вылеціць 15 верасьня раніцою.

А. Чарвякоў.

КАСТРЫЧНІК НА БЕЛАРУСІ.

Аднаўленьне старых дэмакратычных беларускіх арганізацый выклікала поўную дэмакратызацыю беларускага цэнтру. Рада беларускіх арганізацый, абраная ўлетку 1917 году, выключыла з свайго складу абшарнікаў, ксяндзоў і склалася пераважна з сяброў Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Дэмакратызаваная Рада беларускіх арганізацый зрабілася больш небясьпечнай для пралетарскай рэвалюцыі. Рада імкнулася сваю пляцформу будаваць так, каб падладзіцца пад рэвалюцыйныя настроі сялянства. Самы склад яе быў больш дэмакратычны. Хаця па сутнасьці Рада ня ішла далей нацыянал-дэмакратычнае праграмы, але з надворнага боку яна мела рэвалюцыйны выгляд. Гэта дало ёй магчымасьць павесьці працу па заваяваньні інтэлігенцыі і сялянства. Работа пайшла, у першую чаргу, сярод вайсковых беларусаў. Адбыліся зьезды Заходняга, Паўднёвага, Паўночна-Заходняга, Румынскага фронту. На гэтых зьездах Рада і Беларуская Сацыялістычная Грамада адыгрывалі першую ролю. Абіраліся вайсковыя рады. Рэзалюцыі гэтых зьездаў складаліся так, каб, з аднаго боку, задаволіць рэвалюцыйныя настроі ды імкненьні салдат (сялян), а з другога боку, каб правесьці пункты аб падтрыманьні і ўзмацненьні палітычнага стану Рады.

Такім чынам, побач з паступовым зьбіраньнем сіл, каля бальшавікоў і Саветаў Беларусі дзеля захапленьня ўлады беларускімі рабочымі і сялянамі ішла зусім самастойна праца беларускіх нацыяналістычных арганізацый, якія імкнуліся зьбіраць навакол сябе сілы пераважна сялянства і сялянскае інтэлігенцыі, каб накіраваць іх супроць саветаў, супроць сацыялістычнае рэвалюцыі.

Галоўным пунктам барацьбы між рэвалюцыйнымі і супроцьрэвалюцыйнымі сіламі Беларусі за далейшыя шляхі рэвалюцыі было нацыянальнае пытаньне.

Замест усіх пытаньняў сацыяльнай рэвалюцыі, у тым ліку і нацыянальнага, як гэта робіць кампартыя, па першы плян высоўвалася нацыянальнае пытаньне, як зусім самастойнае, як тое пытаньне, вырашэньне якога павінна стаяць наперадзе вырашэньня ўсіх іншых пытаньняў рэвалюцыі. Такая тактыка была тым больш лёгкай, што сацыяльныя і нацыянальныя ўзаемадносіны ў Беларусі былі надзвычайна заблытаныя.

Нацыянальны склад жыхароў Сав. Беларусі ў проц. такі:

Вясковага насельніцтва:

Беларусаў—75,90, рускіх — 16,20, палякаў—2,05, яўр.—5,24, інш.—0,61.

Гарадзкога:

Беларусаў—40,74, рускіх — 10, 65 палякаў—2,46, яўр.—44,14, інш. 2 ,01

Усяго:

Беларусаў—70,79, рускіх — 15,41, палякаў—2,10, яўрэяў—10,88, інш.—0,32.

Цяжка высьветліць сучасны нацыянальны склад Заходняй Беларусі, бо польская ўрадовая статыстыка імкнецца да таго, каб давесьці, што на Крэсах ёсьць польская большасьць. Але думаецца, што мы зробім невялікую памылку, калі, пасьля параўнаньня ўсіх лічбаў, скажам, што нацыянальны склад Заходняй Беларусі такі:

Беларусаў—64 проц., палякаў—16 проц., яўрэяў—12 проц., іншых—8. Беларускае насельніцтва зьяўляецца пераважна сялянскім, а ў гарадох большасьць складаюць яўрэі.

Ня гледзячы на гэта, у царскія часы пануючае становішча ў Беларусі займалі расейцы ды палякі, першыя—ў якасьці прадстаўнікоў адміністрацыі, а другія, як найбольш буйныя землеўласьнікі.

З усяго гэтага відаць, што нацыянальнае пытаньне ў Беларусі ўвесь час стаяла вельмі востра. Сацыяльныя супярэчнасьці паміж клясамі перабліталіся з нацыянальнымі—і паадварот. Важнейшая перашкода па аб'яднаньні рабочых і сялян для рэвалюцыйнай барацьбы ўвесь час была з боку вельмі заблытаных нацыянальных узаемадносін.

Зразумелая рэч, што супроцьрэвалюцыйныя цэнтры імкнуліся выкарыстаць нацыянальнае пытаньне ў сваёй барацьбе за тое, каб прыпыніць пераход Лютаўскае рэвалюцыі, рэвалюцыі буржуазна-дэмакратычнай у рэвалюцыю Кастрычнікавую—пралетарскую, сацыялістычную.

Кастрычнікавая рэвалюцыя прысьпешыла канчатковае афармленьне палітычных пляцформ. Супроць камуністычнае партыі і саветаў рашуча выступілі, паклаўшы ў аснову сваёй барацьбы нацыянальнае пытаньне, два цэнтры: «Беларускі Абласны Камітэт» як ідэёвы кіраўнік і арганізацыйна-палітычны цэнтр расейскай і зрусыфікаванай буржуазеі, дробна-буржуазных-мяшчанскіх, інтэлігенцкіх і сацыялзгодніцкіх зрусыфікаваных элемэнтаў, з дамаганьнем краявой (абласной) аўтаноміі, і «Беларуская рада» «Беларускі Нацыянальны Камітэт» ды іншыя блізкія да іх арганізацыі, як ідэёвыя кіраўнікі і арганізацыйна-палітычныя цэнтры нацыянальных дэмакратычных беларускіх элемэнтаў з праграмай «дэмакратычнай дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі».

Беларускі Абласны Камітэт арганізаваўся ў 1917 годзе з сяброў 1-га Ўсерасейскага Зьезду сялянскіх дэпутатаў у Ленінградзе. Ён стаяў на грунце дэмакратычнага, гэта значыць буржуазнага парадку. Ён ні ў якім разе не дапускаў аддзяленьня Беларусі ад дэмакратычнай-жа, гэта значыць буржуазнай Расеі. Ён ня верыў у магчымасьць будаваньня сацы

АЛЬБЭРТ РЫС ВІЛЬЯМС.

(Амэрыканскі журналіст.)

Саюзьнікі душаць Савет*).

КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯ РЫХТУЕ ЧЭХАЎ.

Дзеля таго, каб нанесьці савету сьмяротны ўдар, контр-рэвалюцыя выбрала чэха-славакаў. Францускія афіцэры падрыхтоўваюць іх на выкананьне гэтай задачы, прычым чэха-славакі пра гэта зусім ня ведаюць. Палкі гэтых войск выстраіваюцца, згодна стратэгічных вымаганьняў, уздоўж сібірскай чыгункі.

Ва Ўладывастоку іх было 17000. Іх прывезьлі сюды з дазволу савету і тут іх узброілі і кармілі. Французы заявілі, што па чэха-славакаў прыдуць транспартныя караблі дзеля адпраўкі іх на заходні фронт. Кожны тыдзень ім казалі, што караблі ўжо ў дарозе. Але ў порт ня прыходзіў аніводзін карабель. Французы ж ніколі і ня думалі пра тое, каб запраўды пасадзіць чэхаў на судны. Яны ўвесь час насіліся з думкай, каб скарыстаць іх тут у Сібіры дзеля зьнішчэньня Саветаў.

АНГЕЛЬЦЫ—МАСТАКІ Ў АШУКАНСТВЕ.

Ва Ўладывастоку напад павінен быць раптоўны, нечаканы. Спачатку савет трэба ўцешыць мірнымі завярэньнямі, а затым зьнянацку напасьці. А таму перш за ўсё трэба было ашукаць савет выяўленнем дружбы.

Гэта задача была ўскладзена на ангельцаў. Яны раптам адмовіліся ад варожасьці да бальшавікоў. Ангельскі консул з нязвычайнай атакравенасьцю сазнаўся ў сваей ранейшай варожасьці да саветаў. З тэй прычыны, што савет паказаў сваю жыцьцяздольнасьць, ангельцы схіляюцца на тое, каб падтрымаць яго. Перш за ўсё яны хочуць дапамагчы ў справе ўвозу машын.

28 чэрвеня 1918 году ў савет прышлі два сапёрныя афіцэры, якія выказаўшы старшыні Савету, Суханаву сваю пашаноту, паведамілі, што тэлеграмы, што прыходзяць кожны дзень па ангельскае судно «Суффольк», будуць перадавацца савету дзеля апублікаваньня ў газэтах.

Рэдактары газэт радаваліся праз меру. І яны мелі ўсе падставы, каб радавацца.

Але на другую раніцу а 8 гадзіне 30 хвілін—ультыматум чэхаў, якія вымагаюць, каб Савет зарэз-жа здаваўся. Усе чырвоныя салдаты павінны зьявіцца на Унівэрсытэцкі пляц і здаць там сваю зброю. На гэта ім даецца 30 хвілін часу.

Суханаў бяжыць у чэшскі штаб і просіць дазволу склікаць савет.

— Будзьце ласкавы, калі вы зможаце зрабіць гэта ў працягу гадзіны,—холадна адказвае камандуючы чэскімі войскамі.

Калі Суханаў крануўся ісьці, яго заарыштавалі.

У горадзе пра гэта яшчэ нічога ня ведаюць.

ЧЭХІ ЗАЙМАЮЦЬ ГОРАД.

На Сьвятлянскай вуліцы, недалёка ад будынку Чырвонага флёту, я натыкаюся на Прэмінскага (адзін з камісараў), якому чысьцяць боты.

— Вы ўжо з раньня дбаеце пра свой надворны выгляд,—жартую я.

— Так,—адказвае ён спакойна.—Праз цекалькі хвілін я буду хістацца на слупе ліхтара і хачу выглядаць прыгожым нябожчыкам.

Я гляджу на яго зьдзіўлена.

— Чэхі займаюць горад.

Ня ўсьпеў ён гэта сказаць, як вуліца запоўнілася салдатамі. Яны займаюць таксама і бліжэйшыя завулкі.

Усюды відаць салдаты; яны плывуць па лодках праз ціхі, прыбываюць у паравых баркасах з вайсковых караблёў. З узгоркаў і з прыстані насоўваецца на горад, нібы ў густы туман, войска. Пляцы кішаць узброенымі салдатамі. Тут ёсьць досыць узрыўчатых матарялаў, каб зачест гораду зрабіць кучу попелу.

УЛАДЫВАСТОК У РУКАХ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ.

Акупацыя ідзе па пляну, роўна, як па гадзіньніку.

Японцы заўладалі парахавымі магазынамі, ангельцы—вакзалам. Амэрыканцы абружаюць консульства вартай, Кітайцы і іншыя займаюць менш важныя месцы. Чэхі імкнуцца да будынку савету і абкружаюць яго. З гучным «ура!» яны атакуюць яго, ламаюць дзьверы і ўрываюцца ў сярэдзіну. Чырвоны сьцяг сацыялізму зьнят і вывешан трохкаляровы сьцяг самаўладзтва. Уладыасток у руках імпэрыялістаў.

— Савет скінулі,—нясецца па горадзе.

Гэта вестка хутка, як маланка, далятае ў буржуйскі квартал. З будуараў і кафэ, з гасьцініх і спальняў вылазяць шчасьлівыя, апранутыя ў шалкі дамы Сьвятлянская перарадзілася ў вялікі бульвар, заліты пёрамі, рознакаляровымі сукенкамі і парасонамі.

Афіцэры красуюцца ва ўсім сваім бляску—залатыя галуны, палеты звонкія шпоры... На кожным кроку аддаюць чэсьць.

Афіцэраў тут цэлыя сотні. Дзе яны тут ва Ўладывастоку хаваліся да гэтага часу?

А гэтыя нязьлічаныя буржуі! Яны вітаюць адзін аднаго, паціскаюць адзін аднаму рукі, абнімаюцца са славамі: «Савет пашо»—Нібы гэта вялікоднае прывітаньне.

Бедныя чэхі! Гэтыя прывітаньні агарчаюць іх. Пры спатканьні з расейскімі рабочымі яны апускаюць галовы. Некаторыя катэгарычна адмаўляюцца душыць рабочы ўрад. Нікога з іх ня радуе крыжаваньне рабочых. А буржуазею не здавальняе сьвята са сьцягамі і музыкай—яна вымагае крывавай рымскай урачыстасьці, з ахвярамі.

— Яны любяць чырвоны колер,—кажа буржуазея,—мы гатовы даць ім гэту фарбу ў любой колькасьці. Мы гэту фарбу возьмем з іхных венаў.

КАМІСАРАЎ ПАБІЦЬ—НЕ АДВАЖЫЛІСЯ.

Сярод вуліцы пакінут вузкі праход, праз які праганяюць заарыштаваных са зьвязанымі рукамі. З іх зьдзекуюцца, насьмяхаюцца, некаторых б'юць, плююць ім у твар.

З асаблівай злосьцю сустракаюць камісара банкаў, бо ён закрануў самае чулае месца гэтых людзей. Яны выюць, хочуць разарваць яго на кавалкі.

Аднаго за другім праводзяць камісараў праз гэты калідор скрыўленых ад нянавісьці, азьвярэлых гадаў. У процілегласьць ім, твары камісараў на дзіва спакойны. Некаторыя блядыя, але ўсе стваряюць уражаньне цьвёрдасьці. Яны жвава азіраюцца наўкол сябе і, як відаць, усім цікавяцца.

Буржуазея з ахвотай перабіла-б іх тут на вуліцы. Але яна не адважылася зрабіць гэта. Камісараў не пабілі, іх укінулі ў турму.

САЮЗЬНІКІ БАЯЦЦА КРЫВІ.

У даны момант саюзьнікі яшчэ супроць масавага забойства рабочых. Для іх вельмі важна паказаць інтэрвэнцыю як крыжовы паход за дэмакратыю, які з радасьцю вітала-б усё жыхарства. Інтэрвэнцыя яшчэ ня выявілася як моцная рэакцыя.

Уладывасток, па думцы саюзьнікаў, павінен паслужыць як база дзеля паходу на Сібір. Яны не хацелі, каб база стала занадта сьлізкай ад крыві. Там, у глыбіні Сібіры, кроў рабочых і сялян можа ліцца ракой, але ня тут, у гэтым партовым горадзе, на які глядзіць увесь сьвет.

Савет раздушан. Саюзьнікі вітаюць адзін аднаго з посьпехам. Буржуазея ўпіваецца сваей перамогай. Вокны вялікіх дамоў і рэстаранаў заліты сьветам. З кафэ ліюцца песьні і музыка. У цэрквах папы адпраўляюць малебны за цара. Па горадзе гудзяць званы. Увесь горад сьвяткуе і весяліцца.

А ў рабочых кварталах—таемная цішыня, якая перапыняецца толькі плачам жанчын. За спушчанымі фіранкамі ўбіраюць нябожчыкаў. З хлеву чуваць стук малатка. Мужчыны зьбіваюць з негабляваных дошчак труны для забітых таварышоў.

(Працяг будзе).

*) Гл. „С. Б." № 210

На варце краіны Саветаў.

Як мы рыхтуемся да абароны нашай дзяржавы.

Капіталісты ўсіх краін, і асабліва ангельскія, рыхтуюць на нашу дзяржаву ваенны напад. Упэўніўшыся ў тым, што рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу з посьпехам будуюць сваю ўласную дзяржаву, — капіталісты хочуць ізноў спрабаваць узброенай сілай адняць заваёвы Кастрычніка. Яны хочуць адняць фабрыкі і заводы. Яны мараць адабраць у сялянства зямлю і ізноў перадаць яе абшарнікам. Яны думаюць вярнуць у няволю быўшыя каліс-та прыгнечанымі, а цяпер слабодныя нацыянальнасьці, якія ўваходзяць у цесны братэрскі Савецкі Саюз. Яны хочуць адняць у гэтых народаў аўтаномію. Яны хочуць адняць права на самастойнае існаваньне і разьвіцьцё сваей уласнай нацыянальнай культуры. Для таго, каб адстаяць свае заваёвы, рабочая кляса і сялянства Савецкай краіны павінны быць гатовы к абароне сваей дзяржавы. Як жа мы рыхтуемся да абароны?

Камуністычная партыя і савецкі ўрад, напярэджваючы працоўных аб надыходзячай небясьпецы, прыкладаюць усе патугі к таму, каб сапраўды зрабіць нашу дзяржаву непераможнай. Мы ўзмацняем нашу Чырвоную армію і Чырвоны марскі і паветраны флёт. Мы ўвесь час імкнёмся к паляпшаньню навучаньня і выхаваньня нашых чырвоных байцоў.

Усё большыя і большыя посьпехі мы маем у справе нацыянальнага будаўніцтва Чырвонай арміі. Растуць колькасна і паляпшаюцца якасна нацыянальныя часьці Чырвонай арміі. Паступова павялічваецца колькасьць камандзіраў для нацыянальных часьцей. Чырвоная армія ў поўным сэнсе слова зьяўляецца ўзброеным саюзам працоўных розных нацыянальнасьцяў. У яе асобе мы маем тую грозную сілу для капіталістаў, якая ў будучай вайне будзе абараняць інтарэсы прыгнечаных усіх нацыянальнасьцяў.

Але для таго, каб Чырвоная армія была моцная, трэба, каб узмацнялася і добра працавала наша прамысловасьць і сельская гаспадарка. У гаспадарчай галіне мы маем вялікія посьпехі. Перад пагрозай вайны партыя і савецкі ўрад прызвалі ўсіх працоўных узмацніць яшчэ больш сваю энэргію на гаспадарчым фронце для таго, каб ня толькі ня зьнізіць намечаную вытворчую праграму, а павялічыць яе. Вытворчыя сілы нашых фабрык, заводаў і сельскай гаспадаркі растуць і дазволяць павялічыць і палепшыць тэхнічныя сродкі абароны. Гэта-ж дазволіць справіцца і з тымі задачамі, якія пастаўлены жнівеньскім аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б), а менавіта: павялічэньне сродкаў абароны і арганізацыя розных рэзэрваў (грашовых, хлебных і інш.) на выпадак вайны.

Нядаўна пад кіраўніцтвам партыі праведзен «Тыдзень абароны». На працягу тыдню праводзілася вялікая растлумачальная праца сярод усіх працоўных нашага Саюзу аб небясьпецы вайны і нашых задачах. Галоўнай задачай зьяўляецца ўдзел у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны усіх шырокіх слаёў працоўных.

Падрыхтоўкай к абароне краіны ўсіх працоўных займаецца ТДА-Авіяхім. Кожны працоўны павінен стаць сябрам гэтага таварыства і пачаць у ім актыўна працаваць.

Усё разам узятае, патугі партыі, ураду і пад іх кіраўніцтвам усіх працоўных дапамогуць вырашыць і далей усе задачы па падрыхтоўцы краіны к абароне.

П. Кляўцоў.

Масавая вайсковая прапаганда.

У напрамку масавай вайсковай прапаганды палітасьвет. установамі да гэтых часоў зроблена мала: вайсковых куткоў пры хатах-чытальнях зусім мала; гурткоў вайсковых ведаў мы маем усяго 4 проц. з агульнага ліку (агульны лік 2008 гурткоў). Міжнародныя абставіны патрабуюць у першую чаргу наладзіць пры хатах-чытальнях масавую вайсковую прапаганду. Для гэтай працы лепш усяго скарыстоўваць газэты.

Кожную газэту неабходна скарыстоўваць для высьвятленьня наступных пытаньняў.

I. Ваенная небясьпека і падрыхтоўка капіталістычных дзяржаў да вайны і іх правакацыйная роля.

II. Контр-рэвалюцыйная дзейнасьць белагвардзейцаў; іх праца за межамі;

III. Рэвалюцыйныя сілы за межамі; адносіны рабочых да СССР, іх пратэсты, дэманстрацыі супроць ваеннай небясьпекі, рэвалюцыйны рух у Кітаі;

IV. Наша мова; Чырвоная армія, паветраны і марскі флёт; праца ТДА-Авіяхіму.

У. Сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР.

У вёсцы ў дні адпачынку, а таксама вечарамі, трэба арганізоўваць чыткі газэт там, дзе зьбіраюцца сяляне: на вуліцы, у хаце-чытальні, у якога-небудзь селянына; інфармацыю шляхам газэтных вырэзак і плякатаў карысна арганізоўваць гурткі ў с.-саветах, каапэратывах і г. д. Для больш лепшага азнаямленьня з пытаньнямі бягучага моманту карысна з актыўных сялян, моладзі і камсамольцаў арганізоўваць групы гурткоў чытаньня газэт.

Праца гурткоў вайсковых ведаў да гэтага часу ішла нянлянава і з перабоямі, нашы хаты-чытальні ня мелі праграм; зараз праграмы для вайсковых гурткоў распрацаваны НКА і пасылаюцца на месцы.

У пасьненных газэтах неабходна адвесьці вайсковы куток, у якім высьвятляць, што зроблена ўстановай, вёскай у сэнсе ваенізацыі.

П. Капаевіч.

Жанчыны ваенізуюцца.

(Ліст з Мазыра).

Праца па ваенізацыі насельніцтва акругі за апошні час узмацнілася і ахоплівае значны лік жанчын. Ваенізацыя жанчын праходзіць шляхам арганізацыі стралковых і санітарных гурткоў, курсаў першай дапамогі і г.д.

У горадзе Мазыры стала працуе стралковы гурток жанчын у складзе 13 чал., працуюць яны па праграме адзін раз у тыдзень. Пры саюзе нархарч, заводзе «Пралетары», фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» і авіяхім камандзе арганізаваны санітарныя каманды, гэткія-ж каманды ў бліжэйшыя часы будуць арганізаваны пры саюзе мэдсанпрацы і камбінаце.

У некаторых райёнах і вёсках акругі маюцца таксама арганізаваныя гурткі і каманды з жанчын. У ўмовах райёнаў і вёскі цяжка праводзіць працу па арганізацыі стралковых гурткоў. Там не стае падрыхтаваных сіл і неабходных прыладаў, але затое значна разгортаецца праца іншага зьместу, так, напрыклад: у Жыткавіцкім райёне скончылі работу курсы першай дапамогі, у Капаткевіцкім райёне адбыўся выпуск двух санітарных гурткоў, у Лельчыцкім райёне арганізавана 4 вайскова-санітарныя гурткі, гэткія-ж гурткі арганізаваны ў Азарыцкім і іншых райёнах.

Усе гэтыя гурткіў большасьці плянава праводзяць сваю працу, а для кіраўніцтва ёю добра скарыстоўваюць працаўнікоў мэдыцыны.

Б. III.

ПЕРАД ДЭМАБІЛІЗАЦЫЯЙ.

Падрыхтоўка да дэмабілізацыі.

Восень—вельмі адказная пара ў Чырвонай арміі Восеньню часьці Чырвонай арміі, скончыўшы абучэньне вайсковай справе чырвонаармейцаў аднаго году, распачынаюць падрыхтоўку да дэмабілізацыі. У нашым палку з гэтымі чырвонаармейцамі праведзена наступная праца. З усімі чырвонаармейцамі пройдзена і паўторная праграма па падрыхтоўцы пізавога васпізатара. З партыйцамі і камсамольцамі таксама скончана праграма па падрыхтоўцы пізавога работніка на вёсцы і ў горадзе.

Акрамя гэтага, пасьля лягераў пачалі сваю працу курсы, на якіх займаецца 120 таварышоў. Курсы падрыхтоўваюць кіраўнікоў груп і гурткоў вайсковых ведаў (27 таварышоў), каапэрацыі (30 чал.), ізбачоў (15 чал.) і савецкага будаўніцтва (48 чал.).

Заняткі на курсах праводзяцца сіламі таварышоў з палка, а таксама і адказных працаўнікоў менскіх установаў.

Цікава тое, што ўсе курсанты вельмі добра адносяцца да вучобы і вечарам у ленкутку ўступаюць у спрэчкі па розных пытаньнях, якія сёньня закранулі на курсах. У бібліятэку зьвяртаецца чыр-ец і ня пытае «дай мне чаго-небудзь пачытаць», а патрабуе тую кнížку, якую яму нараіў кіраўнік заняткамі.

Пасьля сканчэньня курсаў кожнаму слухачу будзе выдадзена пасьведчаньне.

Дэмабілізаваны чыр-ец будзе першым актыўным правадніком ідэі партыі і савецкай улады на вёсцы.

(6 полк) **С. К.**

Вёска чакае культурных памоцнікаў.

Зараз у лік культурных працаўнікоў вёскі вальлюцца новыя сілы—дэмабілізаваныя чырвонаармейцы.

Кожная хата-чытальня павінна ўзяць гэта пад увагу і скарыстаць для працы новы кадр падрыхтаваных працаўнікоў.

Таварышы, якія зьвернуцца з Чырвонае арміі, акажуць значную дапамогу хаце-чытальні ў справе ваенізацыі насельніцтва. Трэба спадзявацца, што кожная хата-чытальня, залучыўшы дэмабілізаваных чырвонаармейцаў да працы, будзе мець добрых кіраўнікоў вайсковых гурткоў, добрых прапагандыстых за справу ваенізацыі, добрых арганізатараў вайсковых куткоў.

Апроч гэтага, дэмабілізаваны чырвонаармеец, які прайшоў ня толькі вайсковую школу, але і культурнасьветную, зьявіцца найлепшым памоцнікам у агульнай працы хаты-чытальні па падняцьці культурнага ўзроўню вёскі.

М. С—к.

Палітрук паўзе--і мы паўзём.

(З натуры).

Пераменьнікі 5 палка сёньня першы раз у гэтым годзе выйшлі на тактычныя заняткі.

Узвод у наступленьні і абароне. Камандзір узвода тлумачыць:

— Наша задача—зьбіць праціўніка і заняць выгадны рубеж да падходу галоўных сіл.

— Саб'ём, захвацім, толькі адны крошкі застануцца,— заяўляюць усе хорам.

А пасьля занятак на кароценькім разборы камроты адмячае працу стараны абароны:

— Няма сур'ёзных адносін к заняткам. Кепска скарыстоўваюцца лапаткі. Няма ўважлівага назіраньня за праціўнікам, кепска перадаецца загад. Няма клапатлівасьці аб дастаўцы патронаў.

Палітрук крытыкуе наступаючых.

— Галоўнае—дрэннае прыстасаваньне к мясцовасьці.

— Тав. палітрук, дазвольце, мы думалі, што ня трэба, гэта-ж ня бой. Але як убачылі, што вы паўзіцё на горку, то і мы сталі паўзьці—апраўдваюцца пераменьнікі.

— Глядзіце, калі вы на манэўрах так будзеце думаць, то ўсіх вывядуць са строю ў адзін момант, а ў баю заб'юць,—адказвае палітрук.

Я. Б.

У заўтрашнім № нашай газэты

"ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА"

ЗЬМЕСТ

Нататкі аб літаратурнай творчасьці . ВАРОНСКІ
Дзесяты Кастрычнік. З цыклю вершаў . А. ЛЯСНЫ.
Музыка і тэхніка вырабу . . . Ю. ДРЭЙЗІН.
Пераклад з украінскай паэзіі . . ЯВАР.
Белочухрусы (спроба характарыстыкі) . АСТАП ВІШНЯ.
БІБЛІАГРАФІЯ

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

аб т.т., якія не зьявіліся на выхад Менскай гарадзкой арганізацыі ў лягеры ад 9-IX—27 г.

Менскі АК на пасяджэньні бюро, падводзячы вынікі выхаду камсамольскай арганізацыі ў лягеры, выключыў некалькіх камсамольцаў з саюзу, як злосна ўхіліўшыяся ад саюзнай дысцыпліны—катэгарычны адказ пайсьці ў лягеры. Бюро ЦК, разглядзеўшы апэляцыйныя заявы чатырох т. т., сярод іх 2 камсамольцы і партыйцы—вынесла наступную пастанову:

«1. Лічыць бязумоўна правільным у асноўным рашэньне Менскага АК адносна т.т. Серабранскага, Мінькова, Райко і Дасько, але даючы ім апошнюю магчымасьць паправіцца, бюро ЦК пастанаўляе:

а) т. Мінькова заставіць у саюзе, вынесьці яму суровы выгавор, з напярэджаньнем давесьці аб яго паступку да ведама КК партыі;

б) т. Серабранскага заставіць у саюзе, вынесьці яму суровы выгавор, давесьці да ведама аб яго паступку КК партыі;

в) т.т. Райко і Дасько заставіць у саюзе, вынесьці ім суровы выгавор".

ЖОРСТКА КАРАЦЬ ЗА ЎХІЛЕНЬНЕ АД ДЫСЦЫПЛІНЫ.

Зьмешчанае ў сёньнешнім нумары нашай газэты пастанова бюро ЦК ЛКСМБ аб таварышох, якія не зявіліся на выхад у лягеры менскай арганізацыі, гаворыць аб тым, што камсамольскія ячэйкі і камітэты павінны павесьці рашучую барацьбу з расхлябанасьцю і недысцыплінаванасьцю ў камсамольскіх шэрагах. І асабліва жорстка караць камсамольцаў у тым выпадку, калі іх ухіленьне ад саюзнай дысцыпліны зьвязваецца з задачай ваенізацыі камсамолу, з задачай узмацненьня боядольнасьці нашага саюзу.

Выхад менскай гарадзкой арганізацыі ў лягеры, бязумоўна даў у агульным сталыя вынікі—падняў зацікаўленасьць камсамольскай масы да вайсковай справы. Адначасова гэты выхад зьяўвіўся праверкай таго на колькі арганізацыя падрыхтавана ў вайсковай справе,—на колькі яна зьмітавана і боядольна на час вайсковай небясьпекі.

Мы ня будзем разглядаць вынікаў гэтага мерапрыёмства Менскага АК, а дадзім некаторую характарыстыку тым т. т., аб якіх справа ідзе ў пастанове бюро ЦК, каб гэтым самым паказаць усёй арганізацыі на неабходнасьць барацьбы з такімі фактамі—пастункамі асобных камсамольцаў.

1. Тав. Мінькоў (яч. хрукароў), член КСМ з 1921 г., член партыі, рабочы, ячэйкавы актывіст,—на прапанову пайсьці ў лягэр катэгарычна адмовіўся і сказаў, што ён гаворыць ад імя усіх мабілізаваных, як у яч. КСМ, так і ў яч. КПБ.

Чым жа матывуе т. Мінькоў свой ня выхад у лягеры?

У заяве на імя ЦК ён піша: „Я считаю, что за то, что я один раз не пошел в лагери, не исключают из комсомольской организации. В 1921 году, когда я еще был мальчишкой я всегда ходил на 8 верст на занятия в ЧОН, несколько раз был в лагерях и т. д.». А на пасяджэньні КК ЦК дадаў: іду зараз у Чырвоную армію (1905 г. н.) і перад гэтым хачу адпачыць. Што я, мол, ведаю вайсковую справу, тым болей, што іду ў армію і мне лягеры нічога-б не далі. Справа ня ў тым, ведае, ці не камсамолец вайсковую справу (вельмі добра, калі камсамолец умее ўладаць вінтоўкай),—а справа ў тым, што тут злоснае ўхіленьне ад саюзнай дысцыпліны. Апрача гэтага, т. Мінькоў—стары камсамолец, член партыі, ячэйкавы актывіст, гледзіць на справу з пункту гледжаньня сваіх асабістых інтарэсаў (мне лягеры нічога-б не далі) і гэтым самым забывае задачу—інтарэсы партыі і камсамолу.

2. Тав. Серабранскі—член КСМ з 1922 г., канд. партыі, рабочы, актыўны камсамольскі працаўнік—намесьнік старшыні клюбу КІМ. У лягеры зьявіўся, але як на дарозе ў лагеры, так і ў самых лягерах трымаў сябе разлагаюча—ляўся з камандным складам. Разлагаюча трымаў сябе ў камсамольскім аркестры (сэкратар старастату аркестра), што мела ўплыў на ўвесь аркестр, які адмовіўся іграць.

Таварышы Мінькоў і Серабранскі атрымалі належную кару ў камсамольскай арганізацыі, партыйныя ворганы (куды справа перадаецца) таксама не пагледзяць па галоўцы.

3. Таварыщы Райко і Дасько—члены КСМ з 1924 г. (яч. МШВ МББ) актывісты ячэйкі Першы (Райко) член бюро ячэйкі і вайсковы работнік, сэкратар цэх. ячэйкі. Дасько таксама быў палітасьветчыкам ячэйкі, зараз кандыдат бюро цэх. ячэйкі. Абодвы катэгарычна адмовіліся пайсьці ў лягеры, матывуючы тым, што ўжо раз былі ў лягерах і падругое тым, што згодна пастановы АК таварыш. 1908 г, нараджэньня ад выхаду аслабаняюцца. Праўда, такая пастанова АК была, але яна мела агульны характар, і ні ў якім разе не выключала магчымасьці таго, што ў асобных выпадках т. т. 1908 г. павінны былі пайсьці, асабліва, калі гаварыць аб камсамольскім актыве.

Усе чатыры т. т., аб якіх вынесена пастанова Бюро ЦК, зьяўляюцца камсамольскімі актывістамі, што яшчэ больш паглыбляе іх віну. Бо калі наш актыў будзе так адносіцца да выкананьня баявой задачы—ваенізацыі камсамолу, то што будзе гаварыць камсамольская маса?

С. Радкевіч.

ПАДСЕЛЬСКАЯ КАМСАМОЛІЯ.

(Чачэвіцкі райён, Магілеўшчына).

У глухім кутку Чачэвіцкага райёну, у вёсцы Падсельле ў маі м-цы 1924 г. адчынілася камсамольская ячэйка, пачын якой паклалі чатыры камсамольцы з Чыгрынскай ячэйкі. За гэты тэрмін свайго існаваньня яна значна вырасла і ўзмацнілася, як з арганізацыйнага боку, так і з выхаваўчага. У сучасны момант у ячэйку ўцягнута найбольш перадавая актыўная моладзь двух сельсаветаў, якая цяпер, налічвае 17 членаў, з якіх па сацыяльнаму стану 14 беднякоў, 1 батрак, і 2 сераднякі, па нацыянальнасьці—беларусы. Камсамолія не абмяжоўваецца сваей працай як правядзеньне сваіх сходаў, яна прымае актыўны ўдзел у грамадзкай працы. Напрыклад, усе камсамольцы зьяўляюцца сябрамі МОПР'у, два сябры сельсавету, амаль што ўсе з іх каапэраваны.

Ядро ячэйкі даволі моцнае складаецца з 1 члена партыі і двух кандыдатаў. У апошнія часы ячэйка стала праводзіць свае сходы ў тых вёсках, адкуль камсамольцы, што значна падымае аўтарытэт ячэйкі сярод сялянства, а з другога, гэткі мэтад сходаў дае прыліў у свае шэрагі беспартыйнай сялянскай моладзі. Таксама праводзяцца агульныя сходы сумесна з парт'ячэйкай, што спрыяе таму, каб ячэйка ЛКСМБ запраўды стаяла па ленінскім шляху, якой даецца палежнае кіраўніцтва.

Выхаваўчая праца камсамольцаў праводзіцца ў палітгуртку, які разьбіт на тры пад'райёны і раз у тыдзень зьбіраюцца ўсе і вызначаюць далейшы напрамак працы па вывучэньні палітграматы.

Ёсьць сельска - гаспадарчы гурток, якім кіруе стары беспартыйны селянін, але працы ён асаблівай ня вёў. Зацікаўленасьць-жа з боку камсамольцаў па падняцьці ўраджайнасьці сваіх палёў ёсьць. Аб гэтым сьведчыць тое, што некаторыя прабуюць новую форму апрацоўкі зямлі. Ячэйка арганізавала атрад піянэраў з 40 чалавек, з якім вядзе сталую працу. Нагрузку маюць поўную 8 камсамольцаў, а рэшта прымацаваны да іх.

Дысцыпліна ёсьць, аб чым сьведчыць поўны збор камсамольцаў на баявую праверку—манэўры.

Наогул, падсельская камсамолія як арганізацыйна, так і палітычна ўзмацняецца з кожным днём. К недахопам трэба аднесьці малую колькасьць дзяўчат—камсамолак, на што трэба зьвярнуць увагу пры далейшай працы.

Я. Савіцкі.

Прыём на беларускае аддзяленьне Смаленскага рабфаку.

(Ад уласнага смаленскага карэспандэнта).

5-га верасьня скончыўся прыём на беларускае аддзяленьне Смаленскага рабфаку. Усяго было прынята 60 асоб.

Дзеля таго, што беларускае аддзяленьне цяпер зьяўляецца адзіным для ўсёй РСФСР, бо прыёму на беларускае аддзяленьне Бухарынскага рабфаку ў гэтым годзе ня было, сюды зьехаліся з усіх бакоў: ёсьць і з далёкай Сібіры, з Туркестану, ёсьць і з бліжэйшых губэрняў—з Пскоўскай, Бранскай і гэтак далей.

Тое, што Смаленскае беларускае аддзяленьне зьяўляецца адзіным, надае яму асаблівае значэньне. Мы маем на РСФСР не адзін дзесятак тысяч беларускага насельніцтва. Асабліва шмат яго ёсьць у Сібіры. Сярод гэтай масы беларускага насельніцтва ёсьць шмат дарослых сялян і рабочых, якія жадаюць вучыцца на роднай мове, якім цяжка на расейскім рабфаку.

Установам, якія атрымалі месцы для камандыроўкі на рабфак, варта было адабраць лепшых кандыдатаў і камандыраваць на рабфак у Смаленск. Але відаць, што камандыроўкі выдаваліся абы як. Мы маем выпадкі, калі на рабфак, замест дарослых, Пскоўскі ГубАНА прыслаў 16-цігадовую дзяўчыну, якой трэба вучыцца не на рабфаку, а ў 7-гадовай школе; таксама адтуль-жа камандыравалі хлопца 17 г., у той час, калі на рабфак прымаюцца толькі ад 18 г.

Быў і такі выпадак, калі прысылалі такога беларуса, які ніводнага слова пабеларуску ня ведае і ведаць ня хоча. А адзін з валасных выканкомаў прыслаў яўрэя, у якога родная мова яўрэйская, а не беларуская.

З некаторых камандыровак відаць, што таму ці іншаму таварышу яны даваліся на беларускае аддзяленьне таму, што ня было камандыроўкі на расейскае аддзяленьне. Усё гэта паказвае, што ня ўсе нашы ўстановы аддаюць належную ўвагу працы сярод нацменшасьцяў.

Гэта пацьвярджаецца тым, што ня ўсе губэрні выканалі дадзены ім лік камандыровак і прысылалі значна меншы лік таварышоў, чым было для іх вызначана.

Усё гэта востра ставіць пытаньне перад Наркамасьветы РСФСР аб тым, што трэба паставіць працу на месцах так, каб камандыроўкі ня гінулі, а даходзілі да беларускага насельніцтва.

Ус. Ганчароў.

АНАТОЛЬ ВОЛЬНЫ.

Антон Савіцкі*).

(Аповесьць).

Паліцыя шукае вядомага рабаўніка Савіцкага. Савіцкі рыхтуе напад на абшарнікаў Сівагорава і Ямбржыцкага, якія на палявaньні нібы нясумысьля забілі селяніна Загонава. Невядома дзе зьнікае абшарнік Ямбржыцкі. Сівагораў едзе ў горад за дапамогаю тайнай паліцыі. Разам з ім у купэ, як выявілася, едзе старшыня дзяржаўнай нарады Акімаў, які, даведаўшыся аб злачынствах Савіцкага, абяцае дапамогу з Пецярбургу. Тайная паліцыя дзейнічае ў сваю чаргу. Савіцкі са сваім найбліжшым сябрам Рыгорам ідуць „у рукі паліцыі". „Баль" у Сівагорава. Губарнатарская нарада. Савіцкі ў Сівагорава.

— А і здорава-ж наш мужычок езьдзіць!—зазначыў ён.

— Ваш мужычок—гэта і ёсьць Савіцкі...—крыва ўсьміхаючыся, сказаў Сівагораў.

Пакінуўшы далёка ззаду ўсіх памешчыкаў, Савіцкі ва ўсю моц імчаў наперад..., дзе пачынаўся лес.

Першыя хвоі ветліва спаткалі Савіцкага, узьняўшы свае галіны-рукі, нібы сполах ахапіў іх, нібы яны дрыжэлі за Савіцкага... І толькі калі прашумелі першыя хвоі, і сьвежым лясным пахам павеяла з лесу, Савіцкі прыпыніў каня і абярнуўся. Пагоні ня было чуваць...

Ад'ехаўшы спакойна яшчэ некалькі вёрст, Савіцкі на ходу саскочыў. Спуджаны конь паімчаў дамоў...

Савіцкі адышоў у лес і з-за хвоі сачыў за пагоняй. Некалькі хвілін нічога ня было чуваць, потым пачуўся стук капыт, і разам з ім паказаўся наезьнік, які ляцеў, што было сілы. Савіцкі падпоўз бліжэй да шляху, выняў браўнінг і чакаў.

На гэтым месцы храбры ўздагоншчык павінен быў заплаціць сваёй галавой...

Але калі яздок быў ужо зусім блізка, Савіцкі, углядзеўшыся, відаць, зьмяніў свой замер, бо хутка схаваў рэвальвэр і выбегнуў на шлях, падняў руку, даючы гэтым ездаку сыгнал супыніцца.

І сапраўды, як гэта ня дзіўна, але яздок на ходу стрымаў каня і паслухмяна застанавіўся.

Савіцкі падышоў да наезьніка і далёка ня злым голасам сказаў:

— Зноў вы... Слухайце, ну, куды мне схавацца ад вас?

Так... гэта была адзінюткая ў сваёй пагоні Зіна.

— Выбачайце,—засароміўшыся сказала яна,—але я так была рада, убачыўшы вас, што чуць не нарабіла вам няпрыемнасьцяў.

— Ну, якія там няпрыемнасьці?—адказаў Савіцкі,—проста мяне забілі-б, бо бачылі-ж самі, колькі іх было.

— Я вас шукала,—не зьвяртаючы ўвагі на словы Савіцкага, зачырванеўшыся, сказала Зіна.—Вы мне скажаце, дзе мой брат, праўда?

— Ён у нас... У лягеры... нахмурыўшыся сказаў Савіцкі.

— Вы яго адпусьціце? Так як і мяне?—гледзячы на Савіцкага, наіўна і шчыра запытала Зіна.

— Магчыма... Калі ён зробіць тое, што мы яму загадаем...

— Я ўпэўнена, што ён зробіць, дзелавіта адказала дзяўчына.—Я ў гэтым нават ня сумнаваюся... І... яшчэ аб адным я хачу пагаварыць з вамі. Калі я захачу вас убачыць, скажэце, як гэта зрабіць? Адкажэце мне... Я буду сур'ёзнай і ніхто нічагутки не даведаецца...—паабяцала Зіна.

— Вы слаўнае дзіцянё,—сказаў Савіцкі. Толькі вельмі-ж дзіцянё! І я-б вам сказаў, дзе можна мяне пабачыць, але я і сам гэтага ня ведаю. Адрасу ў мяне няма...—сур'ёзна і нават крыху з журбою сказаў Савіцкі.—Ну, але як бы там ні было, я даю вам слова ў першую-ж больш-менш спакойную хвіліну быць у вас.

— І гэта праўда?—усьцешылася Зіна.

— Праўда! Але бывайце!

І не пасьпела Зіна выказаць яшчэ адну думку, якую асабліва ёй хацелася сказаць Савіцкаму, як ён ужо быў у хвойніку, а праз некалькі хвілін і зусім схаваўся ў гушчары лесу.

Са смуткам, з нявыказаным болем Зіна паехала назад.

З краю лесу ўздымаліся вялікія чырвоныя снапы полымя. Гэта палаў маёнтак Сівагорава...

Калі-ж Зіна зусім выехала з лесу, то заўважыла, што вялікі ланцуг па

У прэзыдыуме ЦВК БССР.

15-га верасьня пад старшынствам тав. **А. Червякова** адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР, на якім быў прыняты шэраг пастаноў:

НОВЫ ПАРАДАК ВЫБАРАЎ НАРОДНЫХ СУДЗЬДЗЯЎ.

Да гэтага часу існаваў пастуны парадак выбараў народных судзьдзяў: прэзыдыумы акруговых выканаўчых камітэтаў, па прадстаўленьні акруговых судоў, выбіралі народных судзьдзяў, кандыдатуры якіх канчаткова зацьверджаў НКЮстыцыі.

Згодна прынятай пастановы ЦВК і СНК БССР, судзьдзі абіраюцца акруговымі выканаўчымі камітэтамі з кандыдатаў, якія вылучаюцца АВК, РВК, гарадзкімі і сельскімі саветамі.

У здпаведнасьці з гэтым зьменам артыкул 16 Палажэньня „Аб судабудаўніцтве БССР".

АБ ПРЫМУСОВЫМ ПАЦЯСЬНЕНЬНІ Ў ДАМОХ.

У зьвязку з бракам жыльлёвай плошчы, Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў пастанову ЦВК і СНК, якая прадугледжвае прымусовае пацясьненьне жыльцоў у дамох.

Калі ў наймальніка жылога памяшканьня ёсьць лішні непраходны пакой, ня зьвязаны з іншымі занятымі ім пакоямі, які мае асобны выход на вуліцу, то такі пакой домакіраўніцтва мае права перадаць іншаму наймальніку.

Домакіраўніцтва мае таксама права патрабаваць ад наймальніка кватэры пацясьніцца, калі наймальнік займае больш плошчы, чым гэта прадугледжана па закону, каб правесьці ў кватэры перабудовы ці разгародку, і гэтым самым атрымаць лішку плошчы для перадачы іншаму жыльцу.

Магчымыя спрэчкі па гэтых пытаньнях разглядаюцца судом у 2-х тыдніёвы тэрмін ад дня паступленьня справы

АБ АПЛАЦЕ ЗВЫШМЕРНЫХ РАБОТ.

Прэзыдыум ЦВК БССР прыняў пастанову аб аплаце звышмерных работ.

Рабочыя і служачыя дзяржаўных, грамадзкіх і капіталістычных прадпрыемстваў і ўстаноў маюць права атрымаць за звышмерныя работы, якія вяліся імі па загаду наймальніка, ці з яго ведама, незалежна ад таго, ці атрымаў наймальнік здпаведны дазвол ад Інспэкцыі працы.

За звышмерную работу ня маюць права атрымаць узнагароду асобы, якія атрымліваюць зарплату па тарыфу адказных працаўнікоў, ці персанальныя аклады, а таксама тыя, для якіх ненармаваны рабочы дзень устаноўлен калектыўным дагаворам. Рабочым і служачым з нармаваным рабочым днём забараняецца назначаць набаўкі да асноўнага акладу зарплаты замест аплаты звышмернай работы.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПА ДАКЛАДУ БАРЫСАЎСКАГА ГАРСАВЕТУ.

Заслухаўшы справаздачу Барысаўскага гарадзкага савету аб дзейнасьці яго з 1 студзеня да 15 жніўня 1927 г. Прэзыдыум ЦВК БССР адзначыў:

Барысаўскі гарсавет мае пэлы шэраг дасягненьняў. За справаздачны пэрыяд гарсавет здалеў уцягнуць у сваю працу шырокія колы рабочых гораду, вывяўшы іх актыўнасьць. Значна павысілася актыўнасьць членаў гарсавету на пасяджэньнях пленумаў і сэкцый. Паведаньне пленумаў узрасло, галоўным чынам, за кошт рабочай часткі гарсавету.

Можна канстатаваць плённае выкананьне асноўнага наказу, дадзенага дэпутатам гарсавету пры перавыбарах.

Сталая праца гарсавету праз пленумы і сэкцыі набліжае да практычнага абслугоўваньня насельніцтва. Расьце і мацнее сувязь гарсавету з шырокімі масамі рабочых абіральнікаў, а таксама расьце аўтарытэт яго. Найбольшая ўвага аддасьцца пытаньням гаспадарчага і культурнага характару. Ёсьць таксама значныя дасягненьні ў галіне забесьпячэньня насельніцтва медыцынскай дапамогай, у галіне жыльлёвага будаўніцтва, правядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня і інш.

Адначасна з гэтым прэзыдыум ЦВК БССР зварочвае ўвагу на наступныя недахопы:

Невыстарчальна зьвернута ўвага на ўцягненьне ў працу гарсавету практыкантаў і дэлегатак, прымацаваных да сэкцый. Слаба разьвіта дзейнасьць прамыслова-гандлёвай і РСІ сэкцый. Члены гарсаветаў яшчэ мала ўносяць на разгляд пленуму і прэзыдыуму гарсавету, а таксама і сэкцый, практычных прапаноў. Не паслаблен яшчэ жыльлёвы крызіс, ня гледзячы на тое, што шмат будынкаў асвабадзілася з-пад былых акруговых устаноў. Палітычна-гаспадарчыя пытаньні (зьнижэньне розьнічных цэн, рацыяналізацыя апарату, барацьба з бюрократызмам і інш.) мала выяўлены ў працы гарсавету і яго сэкцый.

Мала зварочваецца ўвагі на праверку выкананьня дырэктыў вышэйшых органаў улады, а таксама пастаноў пленуму і прэзыдыуму гарсавету.

Адзначыўшы паказаныя дасягненьні і недахопы, прэзыдыум ЦВК запрапанаваў наступнае:

У далейшым устанавіць рэгулярныя справаздачы дэпутатаў гарсавету перад абіральнікамі і растлумачыць ім іх правы адзываць дэпутатаў, калі апошнія ня выконваюць сваіх абавязкаў.

Запрапанаваць СНК абмеркаваць заяўкі Барысаўскага гарсавету на скančэньне пабудовы міжрайённай больніцы, на пабудову мосту праз раку Сху і дамбу, разбураных навальніцай, а таксама на пабудову электрастанцыі ў горадзе Барысаве.

Менскаму акруговаму выканаўчаму камітэту прапануецца ўзмацніць кіраўніцтва Барысаўскім гарсаветам, а таксама вывучыць пытаньне аб рацыяналізацыі апарату і штатаў з мэтай яго скарачэньня.

Двухтыднёвік ашчаднасьці.

Пасьпешнае распаўсюджаньне дзяржаўных пазык і павялічэньне ўкладаў у касы ашчаднасьці—удар па палітыцы нашых ворагаў.

Што гавораць аб ашчаднасьці працоўныя.

15 верасьня адбылося пасяджэньне фінансава-падатковай сэкцыі Менскага гарсавету, прысьвечанае пытаньню справы ашчаднасьці.

На пасяджэньні заслуханы інфармацыі членаў сэкцыі аб падрыхтоўчай працы да 2-хтыднёвіка на мясцох.

Што-ж робіцца ў гэтай галіне ў Менску?

У Наркамфіне сьпяць.

— У Наркамфіне,—гаворыць член сэкцыі,—падрыхтоўчая праца пэстаўлена слаба. Мясцком нават ня хоча ставіць па агульным сходзе пытаньня аб значэньні ашчаднай справы:—у нас, кажуць, ідуць, перавыбарныя кампаніі—дэлегацкіх сходаў і прафарганізацый, і нам не да ашчаднасьці.

У польпэдтэхнікуме добра.

Тав. Клыс гаворыць, што ў польпэдтэхнікуме пэдагагічны савет вынес пастанову атрымліваць зарплату праз касу ашчаднасьці, што гэтымі днямі і будзе афармлена мясцкомам. Дагаварваюцца пэдтэхнікумы з суседнімі школамі, каб разам правесьці гэтае мерапрыёмства. Калі зьедуцца ўсе студэнты, дык мяркуецца арганізаваць касу ашчаднасьці, праз якую будзе выдавацца стыпэндыя.

«А ў нас нават і ня чулі».

Гаворыць член сэкцыі з прыгараду, селянін Данілевіч, што такое за 2-х тыднёвік: няма ў нас ні плякатаў, і ня было ніякіх сходаў. Адным словам, забылся пра нас.

Ня ведаюць і тут пра 2-хтыднёвік.

Член сэкцыі—чыгуначнік—скардзіцца на тое, што атрымліваюць малую пэнсію, і няма чаго класьці ў касу. Відаць таму мясцкомы і не праводзілі з рабочымі сходаў, і рабочыя зусім ня ведаюць аб кампаніі ашчаднасьці. Але мы думаем, што рабочыя і служачыя ўсыплюць за гэта мясцкому.

Трэба растлумачыць.

В Доўгабродзкай вуліцы земляроб Юрэвіч гаворыць, што галоўныя заняткі жыхароў гэтага райёну—гародніцтва і садаводзтва. Цэны на іх прадукцыю зараз нізкія, і таму гаспадары ўстрымоўваюцца ад продажу, і грошай няма. Але калі належна растлумачыць значэньне кампаніі, дык, відома, знойдуцца грамадзяне, якія адгукнуцца на прызыў улады да ашчаднасьці.

Крок уперад, два назад.

У акрфа адзін месяц ужо практыкавалася выдача зарплаты праз касу ашчаднасьці, але астатак бываў невялікі, усё выбіралі. Прычына ў тым, што данаму пытаньню ні адміністрацыя, ні мясцком не адводзілі належнай увагі. Зараз зноў высоўваюць пытаньне аб атрыманьні пэнсіі праз касу ашчаднасьці.

Што сказала нарада сэкцыі.

У вогуле, нарада фінансава-падатковай сэкцыі канстатавала, што асноўнай прычынай недахопаў зьяўляюцца часта прафарганізацыі, якія ў сваёй працы не аддаюць належнай увагі 2-хтыднёвіку ашчаднасьці.

Сэкцыя арганізавала гарадзкую камісію садзейнічаньня працы кас ашчаднасьці. Пастаноўлена таксама ўтварыць падкамісіі пры ўстановах і прадпрыёмствах, дзе існуюць касы.

В. З—ў.

ТРЭБА ДАЦЬ РАБОЧЫМ КАПІЛКІ.

Рабочыя працкалектыву «Паліграф» на сходзе 14 верасьня **выказалі пажаданьне, каб ім далі капілкі: гэта дапаможа рабочаму зьберагчы нават і дробныя сумы.** Гаварылі яны і аб неабходнасьці наладжаньня больш цеснай сувязі рабочых з касамі ашчаднасьці, якія, па іх словах, зьяўляюцца прыяцелем рабочых.

ЗАРПЛАТУ ВЫДАВАЦЬ ПРАЗ КАСЫ АШЧАДНАСЬЦІ.

Служачыя ВСНГБ на сходзе 14-га верасьня ўхвалілі, **каб зарплата выдавалася праз ашчадныя клясы.** Мясцкому даручана дагаварыцца аб тэхніцы правядзеньня ў жыцьцё гэтага мерапрыёмства. Разам з тым мясцкому даручана намеціць практычныя мерапрыёмствы для ўпрашчэньня карыстаньня паслугамі ашчадных кас.

Вынікі прыёму ў Б. Д. У.

Прыём новых студэнтаў скончан. Было пададзена 1507 заяў на ўсе факультэты і курсы. Не дапушчана да іспытаў 35 чал., галоўным чынам, па ўзросту і з-за адсутнасьці належнай адукацыі; 165 чал. самі не зьявіліся на іспыты.

Неабходна адзначыць, што сёлета паступаючыя куды лепш ведалі беларускую мову, чымся летась. Наогул, у параўнаньні з мінулым годам, патрабаваньні да паступаючых у БДУ значна павысіліся па ўсіх прадметах, але разам з тым моладзь была больш грунтоўна падрыхтавана, чым гэта было раней. Асабліва гэта было прыкметна на гарадзкой і местачковай моладзі.

Найбольш паступаючых ня вытрымалі іспытаў па грамадазнаўству (70 проц. агульнага ліку ня вытрымаўшых); далей ідзе матэматыка і іншыя дысцыпліны.

На ўсіх прадметах вытрымалі іспыты 470 чал., ці 31,1 проц падаўшых заявы, рэшта ня вытрымалі 1-2 і больш прадметаў. Трэба сказаць, што дзякуючы чыста абвостыўным умовам, сялянская моладзь не магла канкураваць з гарадзкой і местачковай. Прыймовая камісія гэта брала пад увагу і у першую чаргу захоўваўся сацыяльны адбор. На ўсе факультэты і курсы прынята 506 чалавек; з іх на факультэт права і гаспадаркі—180, на пэдфак—239, з якіх 42 на яўрэйскую сэкцыю і на мэдфак 84 чалавекі.

Не зважаючы на павялічаныя запатрабаваньні і конкурсныя іспыты, усё-ж сацыяльны склад, у параўнаньні з леташнім годам, значна лепшы. Прынята: 11 проц. рабочых і іх дзяцей; 34 проц. сялян і іх дзяцей; 33 проц. служачых і дзяцей апошніх; 6 проц. самутужнікаў і іх дзяцей і г. д.

Па нацыянальнаму складу:—287 беларусаў, 176 яўрэяў, 24 расейцаў, і 6 палякаў, рэшта—іншых нацыянальнасьцяй. Па партыйнасьці з агульнага ліку прынятых 10 проц. партыйцаў і 20 проц. камсамольцаў, рэшта—беспартыйныя.

Зараз працуе стыпэндыяльная камісія па разьмеркаваньні стыпэндый сярод паступіўшых, з якіх толькі 40 проц. яе атрымае. Усе стыпэндыяты будуць забясьпечаны інтэрнатам. Заняткі на 1 і 2 курсах усіх факультэтаў пачаліся 15 верасьня, а з 20-га яны ужо пойдуць нармальным тэмпам. Пачынаюць ужо працаваць студэнцкія арганізацыі па ўцягваньні паступіўшых ў працу грамадзкіх арганізацый.

В. З-ў.

Галоўлітбел 24864.

Вёска сёньня.

Гаруем бяз школы.

Сяляне вёскі Міхеек, Прашчыцкага с-с, ня маюць свайго памяшканьня для школы. У вёсцы каля 800 душ насельніцтва, і сяляне кожны год наймаюць сялянскую хату пад школу, кватэру для настаўніка, купляюць апал і г. д. Узімку 1926 г. сяляне вывезьлі адпушчаны для пабудовы школы лес. Потым па хадайніцтве сялян і с-с, Слуцкі РВК дазволіў перавезьці адно памяшканьне ў дабавак да ляснога матар'ялу, раскідаць магазын, які ёсьць у вёсцы Міхейках і такім чынам з усяго гэтага матар'ялу збудаваць па пляну 2-хкамплектную школу. Здавалася-б, што ўсе ёсьць ужо, і школа будзе пабудавана, як ня трэба лепш.

Але калі дайшло да самае справы пабудовы школы, дык выходзіць зусім іншае. Слуцкі РВК заявіў старшыні с-с таш. Губановічу, каб сяляне будавалі школу дабрахвотна і на свае сродкі. Сабралі сход і аб усім гэтым старшыня с-с сказаў сялянам. Сяляне школу будаваць не згадзіліся, гаворачы, што яны на збудуюць ле без дапамогі дзяржавы. На сходзе гаварылі, гаварылі і ні дачога не дагаварыліся. Старшыня с-с заявіў:

— Калі цяпер мы ня збудуем у вёсцы Міхейкі школы, калі нам ёсьць магчымасьць, дык увесь матар'ял, які масьца для школы, па прапанове РВК прадасца.

Дык вось школы ў Міхеек ня было і ня будзе ізноў, астаецца сялянам вучыць сваіх дзяцей у цеснай панятай хаце. На гэта пытаньне адпаведным органам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Прашчыцкі с.-с. Слуцкі р.

Кляновы.

Здаюць сел.-гасп. падатак.

Акладныя лісты па сельска-гаспадарчаму падатку на 1927-28 г. па Чэрыкаўскім райёне ўручаны платнікам 16-17 жніўня.

Дзякуючы пырокаму растлумачэньню сярод платнікаў значэньня датэрміновай здачы падатку, в гэтаму часу мы маем паступленьняў 1489 руб., у той час, як тэрмін уплаты яшчэ 11-X 27 г. Большая частка здаюць падатак цалкам.

В. Рабцаў.

Чэрыкаўскі райён, Магілеўшчына.

Не хацелі, а цяпер бядуюць.

Сяляне вёсак Пудзіцка-Слабадзкога сельсавету асабліва вёсак Крэмені і Ананічы ня верылі, што можна атрымаць грошы за градабіцьцё. З іх трудна было сыскаць абавязковае страхаваньне. Грунтаваліся сяляне на тым, што ў 1924 г. град выбіў жыта на 50 проц., а яны атрымалі па 16 кап. за дзесяціну. І калі ў сакавіку гэтага году агент страхаваньня зьвярнуўся да сялян аб дабрахвотным страхаваньні ад градабіцьця, то ў выніку ўсе адмовіліся. Так з 46 гаспадароў вёскі Крэмені застрахаваў толькі адзін, а з 90 гаспадароў вёскі Ананічы застрахавала толькі 4.

Як на тую бяду, калі стала налівацца жыта, град выбіў яго зусім. Па абсьледваньнях аграпома, аказалася: у адным месцы на 75 проц., у другім на 65 пр., у трэцім на 45 проц. У сярэднім-жа па ўсім полі выбіта на 55 проц

Сяляне думалі, што злажыўшы акт так і застанецца, але вышла наадварот. Ня доўга чакаючы, страхавы агент прыехаў і раздаў грошы. На вучастак налучылі па 63 р. гэта на кожную дзесяціну на 10 р.

Хто страхаваў па дабрахвоце, палучыў у 3 разы больш,—замест 10—30 руб. Сяляне цяпер бядуюць, што не застрахавалі на дабраволі. У справе пераканаліся і на другі год можна спадзявацца, **што застрахуе больш-шасьць.**

Немэрк.

Вёска Крэмені, Пудзіцка-Слабодзкага с.-с., Пуч. р., Мен.акругі.

За культуру гаспадаркі.

„З маладых ды раньні".

— З маладых ды раньні,—так гаворыць сяляне вёскі Журавец, Асіповіцкага раёну, на свайго аднасельца перадавіка—культурнага гаспадара Міхася Трыбушоўскага.

І ўзапраўды... Ён толькі два гады, як распачаў сам гаспадарыць і за гэты час яго гаспадарка мае шмат дасягненьняў.

Перш за ўсё малады гаспадар узяўся за пасеў кармяпладаў. Ня ведала вёска, што гэта за зельле такое. Затукалі, закрычалі былі сяляне, калі ён у першы-ж год гаспадараньня засадзіў калі паўдзесяціны кармавых буракоў.

Вырасьлі буракі добрыя. Кароўкі пачалі весьлей паглядваць, сталі болей малака даваць удвая, двайца даўжэй.

Пабачылі гэта сяляне.

— Глядзі, Мікіта. Гэта ад буракоў так. Давай і мы паспрабуем сеяць.

І паспрабавалі. Паспрабавала ўся вёска. Толькі адзін дзед стары яшчэ ня хоча сеяць гэтага „чортавага зельля", але і ён, мне казалі, на лета зьбіраецца сеяць буракі.

Буракі ўжо сталі неабходнай расьлінай на вёсцы.

— Э, як-жа гэта бяз буракоў жыць. Кароў-жа нечым карміць,—гавораць цяперака сяляне, калі ім пачнеш гаворыць, ганіць умысова карняплоды.

Тав. Трыбушэўскі штодзённа праводзіць на словах і на справе—прыкладзе сваю агрэпрапаганду. Ён зімою кіраваў сельска-гаспадарчым гуртком, ён тлумачыць на кожным кроку неабходнасьць культывіроўкі сельскай гаспадаркі.

І сяляне давяраюць яму, сьмела, без апаскі ідуць за ім.

— Калі Міхась што пачаў рабіць, рабі і ты, шкоды ня будзе,—гавораць сяляне.

Зав. Трыбушэўскі ўжо рабіўся згоды ў сялян на калектывізацыю. Справа толькі ў тым, што празнаёлае зямельнае карыстаньне не даваляе правесьці гэтую справу.

— Хутчэй бы зямляўпарадкаваньне,—гавораць сяляне.

І ўсюды, на кожнай справе, тав. Трыбушэўскі першым заправілам і ініцыятарам.

Алесь Дамброўсні.

Бабруйск.

Асушым адвечнае балота.

Сенажаці данілаўцаў знаходзяцца за 8 вёрст ад дому за лесам, ды ў такім балоце, што ўявіць трудна такога балота.

Прыходзілася мокрую з вады траву выносіць за 1—1½ вярсты на выспу па страшэннай грязі. У часе касьбы сенажаціў па гэтую працу ў в. Данілавічах ідзе амаль што ўсё насельніцтва. Нягледзячы на такую цяжкую працу, сена атрымоўваюць данілаўцы з сваіх сенажаціў вельмі мала і сена самай дрэннай якасьці.

Доўга гаварылі данілаўцы, доўга стукаліся, пытаючыся, як пачаць асушку балота і ўрэшце атрымалі дапамогу дзяржавы і пачалася асушка. Для справы асушкі данілаўцы атрымалі ад дзяржавы 5 тысяч рублёў у пазыку на доўгі тэрмін, атрымалі вучонага спэцыяліста, які кіруе справаю асушкі, арганізаваліся самі ў мэліярацыйнае таварыства, і пачалася праца на балоце. Галоўная магістральная канава выкапана і некалькі бакавых. У гэтым годзе будуць пакопаны ўсе канавы і прачышчана будзе рэчка, каб даць сток вадзе.

К вясне будучага году асушка балот закончыцца, і данілаўцы будуць касіць добрае пахучае сена на сухой сенажаці. Будзе асушана больш як 500 дзесяцін балота. На асушаным балоце праведзена будзе праца ўгнаеньня сенажаціў і надсеў добрай травы, каб паленшыць сена.

Селькор.

Койданаўскі р., Меничына.

Нататкі з падарожжа па Нямеччыне.

Карпарацыйныя арганізацыі нямецкага студэнцтва.
Мітынг ня помніку Бісмарку.
Сутычкі паміж „чорнымі" і „чырвонымі".

Прафэсар Камінскі, які нядаўна вярнуўся з Нямеччыны, куды езьдзіў у навуковую камандыроўку, падзяліўся з нашым супрацоўнікам уражаньнямі аб жыцьці нямецкага студэнцтва і аб імкненьні правых да рэстаўрацыі манархіі.

Праф. Камінскі пабываў у Бэрліне, Гарцбургу і Гэйдэльбэргу.

Ня гледзячы на тое, што за апошнія 9 год Нямеччына перажыла шмат зьмен у палітычным жыцьці, новыя плыні зусім мала закранулі нямецкае студэнцтва. Як і даўней, яно разьбіта на паасобныя карпарацыі. Ва ўніверсытэтах навучаюцца, галоўным чынам, моладзь багатых клясаў. Праўда, студэнтамі могуць быць і прадстаўнікі рабочае клясы і дробнай буржуазеі, але як правіла, апошнія катэгорыі студэнцтва, як бы яны ні былі здольны да навукі, ня могуць дабіцца годнасьці навуковых супрацоўнікаў і з часам заняць прафэсарскія катэдры.

У сваёй большасьці студэнты праскінуты правымі ідэямі. Не гаворачы ўжо аб рэвалюцыйных лёзунгах, якіні звычайна захапляецца моладзь, але нават халодна-вытрыманыя і далёка ня чырвоныя ідэалы сучаснай буржуазнай нямецкай рэспублікі зьяўляюцца для іх незвычайнаю крамолаю.

Прафэсар Камінскі праводзіць факт, які добра характарызуе „рэвалюцыйныя" настроі сучаснага нямецкага студэнцтва.

У Гэйдэльбэргу студэнцтва па традыцыі наладзіла карнавал з факелами «факельцуг», у якім прыняло ўдзел амаль усё студэнцтва. Пасьля карнавалу быў наладжан мітынг. Месцам для мітынгу абралі пляц ля помніку Бісмарку, дзе прамоўцы заклікалі студэнцтва любіць сваю бацькаўшчыну, бараніць інтарэсы магутнай Нямеччыны.

Праўда, тут-жа пад бокам знаходзіцца магіла першага прэзыдэнта нямецкай рэспублікі—Эбэрта, які паханы у Гэйдэльбэргу. Здавалася-б, што над яго магілай больш ужо ёсьць сэнсу ладзіць мітынгі, чымся каля помніку ідэалёга манархіі і рэакцыі Бісмарка, але рэспубліканскія „героі", наканітат Эбэрта, мала імпануюць нямецкаму бюргерству, якое марыць аб рэваншы і аб веліччы нямецкай дзяржавы ў выглядзе манархіі.

Зусім слушна, што манархічныя лятуценьні маюць найбольшае месца ў сярэдняй і буйнай буржуазеі, ня кажучы ўжо пра юнкерства. Частыя бойкі паміж „чорнымі"—членамі фашысцкіх арганізацый «штальгельм»—і „чырвонымі"—левымі—зьяўляюцца зараз у Нямеччыне нармальнай штодзённай зьявай. Фашысты нападаюць ня толькі на сацыял-дэмакратаў, але, увогуле, на рабочых. Праф. Камінскі прыводзіць факт, калі ў часе загароднай гулянкі на групу берлінскіх чыгуначнікаў напалі „чорныя", дзе ў выніку бойкі было некалькі забітых і параненых.

— Ці карыстаюцца павагай сацыял-дэмакраты, як рабочая партыя?

— Далёка не,—адказвае праф. Камінскі —гэта ёсьць афіцыйная згодніцкая партыя, якая дапамагае буржуазеі трымаць у паслухмянасьці працоўныя масы. Аб актыўнай клясавай барацьбе нямецкія сацыял-дэмакраты ня думаюць. Яны вядуць „мірную" палітыку рахманых прыслугачоў. Орган с.-д. «Форвэртс» на сваёй ідэалёгіі больш правы, чым былыя расейскія кадэцкія газэты. У дзень Вэймарскай канстытуцыі „Форвэртс" ні адным словам не закрануў клясавай барацьбы і, наогул, інтарэсаў рабочае клясы.

К

ПАПЯРЭДНІ ПРОДАЖ ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Да 16-га верасьня, г. зн. за 10 дзён падпіскі на пазыку індустрыялізацыі, агульная сума прынятай падпіскі па гор. Менску складае 80.350 руб.

1-ае месца па падпісцы займае Менскае Таварыства Ўзаемнага Крэдыту—48.500 руб. У Дзяржбанку прынята падпіскі на 21.200 р., за Усекабанку на 3.650 р., Прамбанку на 1.300 р., Камунбанку на 1.100 р., Белсельбанку на 200 р. і у Галоўнай Ашчаднай Касе на 4.400 руб.

Нагадваецца вялікае зацікаўленасьць да пазыкі з боку шырокіх колаў насьленьня, асабліва з боку прыватных гандлёва-прамысловых колаў, на якіх разьлічана, галоўным чынам, папярэдняя падпіска.

Бліжэйшымі днямі адчыняецца падпіска на пазыку сярод калектываў рабочых і служачых, а таксама па індывідуальнай падпісцы.

Супрацоўнікі шкляного трэсту падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі на 1.000 руб. Падпіска адбываецца таксама і ў іншых калектывах.

У Першым Беларускім Тэатры.

Віцебск. Першы Беларускі Даяржаўны Тэатр прыбыў у Віцебск 4 верасьня ў складзе 55 чалавек мастацкага пэрсаналу і 6 чал. тэхнічнага. Падрыхтоўчая праца пачалася з 6-га верасьня. У сучасны момант праходзіць пераманторыўка некаторых п'ес („Кастусь Каліноўскі", „Мяшчанін у шляхэцтве", „Машака" і інш.). Пераманторыўка гэта неабходна з прычыны повага афармленьня і трактоўкі зьместу гэтых п'ес. Адначасна з гэтым прыступлена к вакальнай і хорэаграфічнай працы.

У зьвязку з тым, што ў рэпэртуары маюцца п'есы, якія патрабуюць хуткай перастаноўкі эпізодаў і карцін, прыдзецца зрабіць некаторае пераабсталяваньне сцэны. Будзе пераабсталёван сьвет, мэханізаваны пад'ёмы і інш. Апроч гэтага, пры тэатры будзе абсталёвана дэкаратыўная майстэрня. Па заканчэньні тэхнічнай працы калектыў тэатру прыступіць к мантыровачным рэпэтыцыям дзевяці п'ес, якія пойдуць у першую чаргу, як-та: „Кастусь Каліноўскі", „Вір", „Каваль-ваявода", „Кар'ора тав. Брызгаліна", «Перамога», «Над Нёманам» і інш. У плян працы тэатру ўваходзіць абслугоўваньне мясцовых рабочых клюбаў са спэцыяльнай праграмай. Незалежна ад спэктакляў на працягу сэзону будуць паказаны 2-3 балетныя пастаноўкі.

Пабудова фруктовага заводу.

У савецкай гаспадарцы Забалацьце, Аршанскай акругі, Белсельтрэст зараз будуе буйны сушня-варачны вінны завод, які пачне працаваць з наступнага сэзону.

Завод будзе перапрацоўваць у віно і сухія фрукты ў год каля 150 тысяч пуд. яблык. Дзякуючы гэтаму, будзе магчымасьць перапрацаваць на месцы самыя горшыя гатункі садавіны.

Ужо дастаўлена з Нямеччыны мэталічная вакуумаўская сушня, якая важыць 2500 пуд. і каштуе звыш 20 тысяч руб.

У 10 гадавіну Кастрычніка будзе закладзен галоўны корпус заводу. Пабудова заводу будзе каштаваць каля 100 тысяч руб.

ХРОНІКА.

100.000 руб. дадаткова на Асінастрой.

Учора Белсельбанк дадаткова перавёў 100 000 руб. Асінастрою. Усяго дагэтуль Белсельбанк адпусьціў Асінастрою 500.000 руб.

150.000 руб. на земляўпарадкаваньне.

15-га верасьня Белсельбанк дадаткова перавёў у акругі БССР 150.000 рублёў на крэдытаваньне расьсяленьня пры правядзеньні земляўпарадкаваньня.

Прадукцыя працоўных калектываў на 15.000.000 руб.

За мінулыя 2 з пал. гады працкалектывы БССР выпусьцілі на рынак больш чым на 15.000.000 руб. прадукцыі свайго вырабу.

93.000 на школьнае будаўніцтва ў Менску.

На 1927-28 год асигнавана 93.000 руб. на школьнае будаўніцтва, з іх значная сума пойдзе на скančэньне пабудовы сямёхгодкі на Ляхаўцы.

Пашырэньне сеткі вячэрніх школ павышанага тыпу.

Згодна пляну Галоўпалітасьветы, у 1927-28 вучэбным годзе на ўсіх акруговых гарадох Беларусі будзе існаваць замест 22 вячэрніх школ павышанага тыпу—25 школ, а каб была ў іх сувязь з ВУЗ'амі, мысьліцца зрабіць гэтыя школы чатырохгадовымі.

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА.

Зьніжэньне цэн.

Менскі Цэрабкоп правёў зьніжэньне цэн на некаторыя свае тавары. Так, хлеб паўбелы зьніжан з 14 к. да 13 к. за кілё, сала—з 1 р. 25 к. да 1 р. 20 к. кілё, некаторыя гатункі абутку «Торгстроя» зьніжаны на 3 проц. Акрамя гэтага, ёсьць некаторае зьніжэньне цэн на галянтарэйныя і інш. тавары.

Забесьпячэньне беларускага рынку галёшамі.

Праўленьне менскага адзяленьня „Рэзінатрэсту", якое абслугоўвае БССР і частку Смаленшчыны, зацьвердзіла плян рэалізацыі галёш на 4-ты квартал.

Згодна гэтага пляну усяго будзе рэалізавана ў БРСР у 4-м квартале 371.400 пар галёш.

ФІЗКУЛЬТУРА.

Розыгрыш усебеларускага пяршынства саюзу хімікаў па футболу.

Зараз ідзе розыгрыш усебеларускага пяршынства саюзу хімікаў па футболу. Розыгрыш адбываецца адначасова ў 4 гарадох. Прымае удзел 8 каманд. Першая гульня адбылася ў Віцебскай акрузе паміж заводамі „Ноўка" і „Труды", якая скончылася перамогай «Повак» з вынікамі 3:1.

Другая гульня была ў Барысаве паміж камандамі фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» і „Домбаль", яна скончылася з вынікам 1:0 на карысьць апошняй.

У Нова-Беліцы гулялі каманды заводаў „Вэзуві" і „Дняпро" (Рэчыца). Гульня скончылася перамогай каманды з Н-Беліцы з вынікам 3:0.

Менская каманда атрымала перамогу над командай Пухавіч.

Каманда „Ноўкі" едзе зараз у Беліцу. 25 верасьня адбудуцца фінальныя гульні, якія выявяць пяршынства.

Розыгрыш пяршынства прафсаюзных гурткоў ФК па гарадках.

З вялікім посьпехам адбываецца зараз розыгрыш па пяршынства прафсаюзных гурткоў фізкультуры па гарадкох. Прымае ўдзел 7 камандз (45 удзельнікаў).

У фінал увайшлі каманды саюзу харчавікоў і хімікаў.

На гэтых днях выявіцца пяршынства паміж гэтымі камандамі).

СУД.

Панскія прыхільнікі.

На лаўцы падсудзімых Казімір Мацэйковіч—родам з Польшчы (польскі падданы) і Барыс Карповіч, селянін вёскі Лясьнікі, Барысаўскае акругі. Адразу відаць, што гэта „дзельцы" аднаго кшталту.

З таго часу, як паміж СССР і Польшчай устаноўлена мяжа, гэтыя два сябры разлучыліся. Мацэйковіч служыў у Польшчы ў паліцыі, а Карповіч на хутары Лясьнікі вёў сваю гаспадарку.

Мацэйковіч, служачы у паліцыі, сумлена выконваў свае абавязкі: ён акуратна даваў сакрэтныя зьвесткі аб сялянстве.

Хутка Мацэйковіч заняў „вышэйшую" пасаду: ён быў назначан „вывадоўцам" польскага генэральнага штабу,—дзе працаваў пад кіраўніцтвам паручыкаў Сухаржэўскага і Скачылла. Гэтыя „кіраўнікі" заправа навалі Мацэйковічу найсьці ў БССР, сабраць некаторыя весткі і, апроч таго, дастаць савецкі пашпарт і чырвонаармейскую кніжку.

Мацэйковіч ахвотна згадзіўся на прапанову. Атрымаўшы на дарогу 20 даляраў і 15 польскіх злотых, ён ноччу перайшоў граніцу і апынуўся на хутары Лясьнікі ў Карповіча.

Пачалася сяброўская гутарка. Мацэйковіч расказаў Карповічу, што ён шпіён, што мае шмат сакрэтных заданьняў і папрасіў Карповіча прытуліць яго і дапамагчы ў яго справе.

Карповіч адразу ўзяўся дапамагаць Мацэйковічу, прычым атрымаў ад апошняга і заздатак за „працу". Здабыўшы ўсё патрэбнае, Мацэйковіч вярнуўся ў Польшчу.

У студзені 1927 г. Мацэйковіч зноў накіраваўся ў БССР шпіёніць, але быў затрыман пагранічнай вартай.

Менскі Акруг. Суд, разгледзіўшы гэту справу, прыгаварыў: Казіміра Мацэйковіча на 4 гады зьняволеньня з суровымі адмежаваньнем, пазбаўл. у правох і з высяленьнем з пагран. паласы на тры гады па адбыцьці кары, а Борыса Карповіча—на два гады зьняволеньня.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

ЗА КРАДЗЕЖ.

29 сьнежня 1926 году Паўло Кручкоўскі, Рыгор Кудрэвіч і Кастусь Фрэйман, змовіўшыся, паламалі вакно ў майстэрні краўцоў „Новае Жыцьцё" і пакралі мануфактуру, гатовую вопратку і інш. Усё гэта яны падзялілі, прычым Кудрэвіч са сваёй часьці даў адрэз на паліто свайцы Марылі Абмётка. 17 лютага сёл. году кампанія з удзелам Арсена Саракотава пакрала ў Язэпа Чакоўскага сала і мяса. Кручкоўскі, Кудрэвіч і Саракотаў затрыманы, а Фрэйман і Абметка ад сьледзтва ўцяклі. Менскі акруговы суд прыгаварыў: Паўла Кручкоўскага на 5 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на 2 гады; Рыгора Кудрэвіча на тры гады і Арсена Саракотава на 1 год зьняволеньня з пазбаўленьнем у правох. Кудрэвіча на 2 гады і Саракотава на 1 год.

Косьці маманта на Беларусі.

(Палеалітычныя раскопкі ў Гомельшчыне).

У вёску Бэрдыж (Гомельшчына) у пачатку верасьня паехала археалёгічная экспэдыцыя Інбелкульту. Экспэдыцыя праводзіць там раскопку палеалітычнай (стара-каменнай) стаянкі.

У склад камісіі ўваходзяць вылатныя прафэсарскія сілы з СССР, ад Інбелкульту і інш.

Раскапаная да гэтага часу тоўшча зямлі запоўнена белымі дробна-зярністымі пяскамі. Пад імі залягае пласт зеленаватага шчыльнага суглінку ў 30-40 сантымэтраў. Суглінак ляжыць на роўнай плошчы, але робіць падвышэньне ў напрамку ад паўночнага ўсходу да паўднёвага захаду і мае выгляд невялікага курганка. Да 8 верасьня ўся гэта тоўшча была зьнята.

Выявілася, што ўся яна ўкрыта касьцямі старажытнай жывёлы. Большасьць касьц